Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 СТУДЗЕНЯ 2007 г. СУБОТА
№ 18 (25883)
Кошт 350 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Вучоным і інжынерна-тэхнічным работнікам навукі

*Паважаныя таварышы!*

Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём беларускай навукі.

Сёння навука, як ніколі раней, патрэбна нашаму грамадству. Толькі на навуковай аснове, з выкарыстаннем навейшых тэхнічных і тэхналагічных рашэнняў магчымае выкананне грандыёзных планаў эканамічнага і сацыяльнага будаўніцтва, прынятых Трэцім Усебеларускім народным сходам.

Дзяржава чакае ад беларускіх вучоных эфектыўных навуковых ідэй і прарыўных тэхналогій ва ўсіх галінах народнагаспадарчага комплексу, і найперш у галіне энергетыкі, інфарматыкі, медыцыны і біятэхналогіі, распрацоўкі новых відаў прадукцыі, радыкальнага павышэння яе якасці і канкурэнтаздольнасці. Неабходныя больш сучасныя падыходы ў эканоміцы, глыбокія даследаванні ў сацыяльных і гуманітарных навуках.

Выказваю шчырую ўдзячнасць вучоным, канструктарам, прафесарска-выкладчыцкаму саставу за адданасць нялёгкаму высакароднаму прызванню, за непахіснае імкненне да навуковай ісціны.

Ад усёй душы жадаю вам, дарагія сябры, здароўя, шчасця, аптымізму, невычэрпных сіл для памнажэння інтэлектуальнага багацця беларускай нацыі, годнага ўкладу ў пабудову моцнай і квітнеючай Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

**Ад вырашэння праблем рэсурсазберажэння, пошуку альтэрнатыўных відаў паліва і крыніц энергіі напрамую залежыць рэальны суверэнітэт нашай краіны. І галоўная роля тут адводзіцца вучоным. Гэта падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас традыцыйнага ўрачыстага ўручэння дыпломаў доктара навук і атэстатаў прафесара навуковым і навукова-педагагічным работнікам.**

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:
# «БЕЛАРУСЬ НА КАЛЕНЯХ НІКОЛІ НЕ СТАЯЛА. НЕ СТАНЕ І ЗАРАЗ!»

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ніякай крызіснай сітуацыі ў нас няма. «За мінулыя гады краіна назапасіла магутны эканамічны патэнцыял. Наша прамысловасць мае дастатковыя рэсурсы, каб справіцца з новымі ўмовамі. Вядома, гэта запатрабуе новых падыходаў і істотнага павышэння эфектыўнасці ўсёй работы. У тым ліку гэта патрабаванне адносіцца да навукі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што адзначаюцца пэўныя станоўчыя зрухі ў справе ўвязкі навукі і вытворчасці. Створаны новыя структуры — навукова-вытворчыя цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук. НАН у пэўнай ступені ўдалося сканцэнтраваць дзейнасць сваіх устаноў на рашэнні народнагаспадарчых задач. Істотна актывізаваўся ўдзел акадэмічных вучоных у правядзенні навукова-тэхнічнай экспертызы і выпрацоўцы прапаноў для ўрада. Аднак, на думку Прэзідэнта, значная частка вучоных акадэміі па-ранейшаму займаецца вельмі адцягнутымі даследаваннямі і стаіць у баку ад асноўных задач.

«Надышоў час яшчэ раз уважліва паглядзець на арганізацыю навукі ў нас у краіне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, усім неабходна жыць па сродках, а кожны ўкладзены рубель павінен прыносіць максімальную аддачу.

Прэзідэнт адзначыў прагрэс у справе падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

«За апошнія гады беларуская атэстацыйная сістэма стала сур'ёзнай перашкодай на шляху нізкапробнай дысертацыйнай прадукцыі, — адзначыў беларускі лідар. — Засталіся ў мінулым «чыноўніцкія дысертацыі», якія здаваліся «пад ключ».

Камусьці гэта можа і не падабаецца. Можна пачуць прапановы пра неабходнасць «змякчэння» курса ВАК.

«Ніякіх паслабленняў не будзе! — заявіў Прэзідэнт. — Вучоны — гучыць вельмі горда. І ў гэту супольнасць можа ўвайсці толькі той, хто сапраўды гэтага варты».

Гаворачы аб сітуацыі, якая склалася з пастаўкамі ў Беларусь расійскіх энерганосьбітаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не трэба зацягваць паясы, як прапануюць асобныя «гарачыя галовы». Дастаткова проста беражліва і па-гаспадарску ставіцца да таго, што мы маем. У гэтым дабіліся поспеху многія краіны Еўропы, якія знаходзяцца ва ўмовах, падобных да нашых.

Як паведаміў беларускі лідар, кантракты на пастаўкі нафты ў Беларусь у лютым 2007 года пакуль не заключаны. Паводле слоў Прэзідэнта, гэта адбываецца па прычыне таго, што расійскія алігархі, не без прыкрыцця зверху, патрабуюць, каб мы набывалі нафту па цэнах, вышэйшых за сусветныя.

«Гэта беспрэцэдэнтны ў свеце выпадак, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Таму дэлегацыя, якая вядзе перамовы, атрымала ад мяне прамыя ўказанні: тыя кампаніі, якія будуць прапаноўваць падобныя кантракты і цэны, тут, у Беларусі, пры прапампоўванні нафты ў Еўропу, будуць абкладацца дадатковымі пошлінамі. Гэта робіцца для таго, каб мы маглі кампенсаваць свае страты. Мы з імі спрачацца не будзем. Гэта іх нафта. Але і мы прапампуем іх нафту ў Еўропу, а гэта каля 80 мільёнаў тон, без страт для сябе».

На думку Аляксандра Лукашэнкі, такія заведама непрымальныя ўмовы для Беларусі па пастаўцы вуглевадародаў вылучаюцца наўмысна. І гэта зусім не новыя павевы. Прэзідэнт на працягу шэрагу гадоў, якія прайшлі пасля рэферэндуму, што вызначыў рух Беларусі да саюза з Расійскай Федэрацыяй, аберагаў грамадства ад тых выпадаў, што рабіліся ў адрас нашай краіны з мэтай разбурэння імкнення народа і кіраўніцтва Беларусі жыць з Расіяй у Саюзнай дзяржаве. А гэта тэндэнцыя з боку Расіі існавала з часоў распаду былога СССР. Аднак, калі пры першым прэзідэнце Расіі такое непапулярнае сярод рускіх людзей імкненне кіраўніцтва РФ насіла завуаліраваны характар, то пры цяперашнім кіраўніцтве Расіі, «вядома, пад чыю дудку тут ідзе пляска».

У якасці прыкладу даўніх няшчырых адносінаў да Беларусі ў рамках Саюзнай дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка нагадаў сітуацыю, калі паміж нашымі краінамі былі зняты ўсе шлагбаўмы.

«На наступны ж дзень Расія вывела мытнікаў на гэтую мяжу! — адзначыў беларускі лідар. — Паміж Беларуссю і Расіяй увесь час існавала менавіта расійская мяжа. Мы не спалохаліся гэтай вялікай дзяржавы і не сталі закрываць сваю тэрыторыю. Мы не спалохаліся нейкіх эканамічных «дыверсій» з боку трэціх краін праз Расію. Хоць выдатна вядома, што ў Расіі ўвогуле няма межаў са многімі рэспублікамі, праз якія амаль бесперашкодна пранікае ўсё: ад тавараў нізкай якасці да наркотыкаў. І мы цярпелі, не ўводзілі мытні, каб нас не папракалі. А яны зрабілі гэта адразу! Дык пра якую Саюзную дзяржаву можна гаварыць?».

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, апошнім часам робіцца ўсё, каб пераканаць, перш за ўсё расіян, у тым, што галоўны разбуральнік саюзных адносінаў — беларускі бок і асабіста Лукашэнка.

«Калі нас ціснулі пакрысе, мы трывалі, але зараз на нас проста накінуліся, — адзначыў кіраўнік Беларусі. — Спачатку двойчы ў два разы (свет такога прыкладу больш не ведае) узнялі цэны на газ, а потым прапанавалі купляць нафту па такой цане, па якой яна нам проста не патрэбна. На тоне перапрацаванай нафты наша прамысловасць губляла б каля 90 долараў!».

У выпадку, калі нагнятанне абстаноўкі з боку Расіі не будзе спынена, Прэзідэнт абяцаў расказаць і іншыя падрабязнасці аб перамовах з кіраўніцтвам Расійскай Федэрацыі. Як, напрыклад, тую, што ва ўмовах новых цэн на энерганосьбіты нам прапаноўвалі закрываць «неканкурэнтаздольныя» прадпрыемствы, не звяртаючы ўвагі на тое, што сотні тысяч людзей застануцца без працы. Маўляў, няважна, беларусы перажывуць...

«Не! Гэтага ў Беларусі не будзе!, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — І мы тут у амбіцыі не кідаемся, мы нафта- і газаправоды не перакрывалі нават у такіх умовах. Гэта зрабіла сама Расія. І пасля ўсяго таго, што адбылося, пасля той рэакцыі ў свеце ў адрас Расійскай Федэрацыі, тым не менш працягваюцца правалочкі для таго, каб нас паставіць на калені. На каленях Беларусь ніколі не стаяла. Не стане і зараз!».

Нягледзячы на заявы расійскіх СМІ, Беларусь не мае намеру кардынальна мяняць свой знешнепалітычны курс.

«У знешняй палітыцы мы знайшлі той адзіны шлях, які магчымы для нашай краіны, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы жывём у цэнтры Еўропы і павінны нармальна жыць і з Усходам, і з Захадам, нармальна жыць з нашымі суседзямі, таму што іх не выбіраюць».

Паводле слоў Прэзідэнта, «не па нашай віне ў нас сапсаваліся адносіны з Захадам, які сёння ўбачыў, што такое Беларусь і што без Беларусі Захаду не ўдасца забяспечыць энергетычную бяспеку, што такія транзітныя дзяржавы, як Беларусь і Украіна, адыгрываюць не менш важную ролю, чым Расія, якая выпрацоўвае энергарэсурсы».

Аляксандр Лукашэнка прапануе ў спрэчцы паміж Беларуссю і Расіяй і аднаму, і другому боку «астыць, асэнсаваць тое, што адбываецца, і не нагнятаць абстаноўку ў тым напрамку, адкуль немагчыма будзе выйсці».

Паводле слоў Прэзідэнта, ён так падрабязна ўвёў вучоных у курс энергетычнай сітуацыі, якая складваецца ў Беларусі і вакол нашай краіны, каб яны лепш зразумелі важнасць задач, якія перад імі ставіць дзяржава.

«Мы будзем падтрымліваць вучоных толькі за высакаякасную, эфектыўную працу і значныя навуковыя вынікі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — У першую чаргу ў распрацоўцы эфектыўных навуковых ідэй і прарыўных тэхналогій, асабліва ў галіне энергетыкі, інфарматыкі, медыцыны і біятэхналогій».

Прэзідэнт шчыра падзякаваў вучоным за іх працу і павіншаваў з Днём беларускай навукі.

«Усе мы — правыя і левыя, партыйныя і беспартыйныя павінны зразумець, што наша суверэнная Беларусь — гэта ўніверсальная каштоўнасць, якая ўсіх нас родніць і аб'ядноўвае», — заключыў Аляксандр Лукашэнка.

**Сяргей ПРОТАС.**

## ПАДАТКОВАЯ «КАСАВІЦА»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Напружаны час у аддзеле кантролю за дэклараваннем даходаў і маёмасці фізічных асобаў Першамайскага раёна сталіцы.

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў:

**Прэзідэнта Індыі Абдула Калама і індыйскі народ з нацыянальным святам — Днём Рэспублікі.**

У віншаванні падкрэсліваецца, што ўсебаковае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі няўхільна развіваецца на карысць беларускага і індыйскага народаў.

**Генерал-губернатара Аўстраліі Майкла Джэфры і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём Аўстраліі**

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што беларуска-аўстралійскае палітычнае і эканамічнае партнёрства будзе мець доўгатэрміновы характар.

**Народную артыстку Беларусі Святлану Акружную з юбілеем**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з юбілеем вядучага майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, народную артыстку Беларусі Святлану Акружную.

Як падкрэсліў у віншаванні кіраўнік дзяржавы, Святлана Акружная, якая змагла стварыць цэлую галерэю яркіх, незабыўных вобразаў, — жывая легенда беларускай сцэны, яе творчасць — гордасць і слава нацыянальнага мастацтва.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Супрацоўніцтва з Беларуссю ніколі не супярэчыла нацыянальным інтарэсам Расіі

**Такую думку выказаў у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Леанід Козік.**

Каментуючы заяву спікера Дзярждумы РФ Барыса Грызлова аб тым, што Расія «не дазволіць ператвараць падтрымку Беларусі ў процідзеянне расійскім нацыянальным інтарэсам», Леанід Козік нагадаў, што наша краіна на працягу многіх гадоў значна скарачала ваенныя, пагранічныя, палітычныя і эканамічныя расходы свайго ўсходняга суседа. «Калі б Расійскай Федэрацыі давялося б за свой кошт будаваць і рабіць усё, што зрабіла для яе Беларусь, Маскве давялося б пайсці на вялікія затраты грошай і часу», — адзначыў старшыня ФПБ. Пры гэтым ён дадаў, што «фактычна Расія мае вялікі доўг перад нашай дзяржавай». Акрамя таго, падкрэсліў субяседнік, Беларусь падтрымлівае стратэгічна неабходную для Расіі сістэму абароны.

Адносна выказвання расійскага скіпера аб «падтрыманні міфаў аб Саюзнай дзяржаве» Леанід Козік рэкамендаваў Барысу Грызлову звярнуцца да саюзных праграм і Пастаяннага камітэта. «Калі там ёсць нейкія неэфектыўныя праграмы, затраты, то гэта іншае пытанне. Ужо даўно настаў час паглядзець і ацаніць работу Пастаяннага камітэта», — адзначыў кіраўнік беларускіх прафсаюзаў. Між тым ён растлумачыў, што, хутчэй за ўсё, прычына рыторыкі спікера Дзярждумы заключаецца ў іншым, «проста многія расійскія чыноўнікі хацелі б бачыць Беларусь у якасці «Паўночна-Заходняга края» ў складзе Расіі».

**Уладзімір ВАСІЛЬКОЎ, БЕЛТА.**

## Беларусь зацікаўлена ў інвестыцыях банкаўскай групы Райффайзен

**Беларусь зацікаўлена ў інвестыцыях банкаўскай групы Райффайзен. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння ордэна Дружбы народаў старшыні праўлення гэтай банкаўскай групы Герберту Стэпічу.**

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, беларуская эканоміка інтэнсіўна развіваецца, і цяпер існуе некалькі перспектыўных праектаў, якія маюць патрэбу ў фінансаванні. «Гэта акупныя праекты, і мы вельмі зацікаўлены ў фінансавай падтрымцы з вашага боку», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да банкіра.

Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку Герберту Стэпічу за высокі ўзровень супрацоўніцтва і падтрымку, якую ўсе гэтыя гады Райффайзен аказвае нашай краіне. «Вы, напэўна, самы мужны чалавек — нягледзячы на вал крытыкі Захаду ў адрас Беларусі, не пабаяліся супрацоўнічаць з намі ў самым адказным сектары — фінансавым», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку Герберту Стэпічу за тое, што банкаўская група Райффайзен «уклала нямала сродкаў, сіл і ведаў у развіццё банкаўскай сістэмы Беларусі». Паводле слоў Прэзідэнта, дзякуючы намаганням гэтага холдынгу ААТ «Пріорбанк» стаў самым перадавым у тэхналагічным плане банкам у краіне. «Усе нашы банкіры вучацца ў яго, як трэба весці банкаўскую справу», — сказаў Прэзідэнт.

Уручаючы ордэн Дружбы народаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэтай узнагароды грамадзяне замежных дзяржаў удастойваюцца «выключна рэдка». Кіраўнік дзяржавы выказаў пажаданне, каб гэта была не апошняя ўзнагарода Герберта Стэпіча на беларускай зямлі.

**БЕЛТА.**

## Банкаўскія зберажэнні беларусаў павялічыліся ў 1,4 раза

**Вынікі выканання Асноўных накірункаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у 2006 годзе і задачы банкаўскай сістэмы на гэты год абмеркаваны 26 студзеня на пашыраным пасяджэнні Праўлення Нацыянальнага банка, якое правёў яго старшыня Пётр Пракаповіч.**

У 1,6 раза павялічыўся агульны аб'ём выдадзеных банкамі доўгатэрміновых крэдытных рэсурсаў (без уліку фінансавага лізінгу), а таксама льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля. Калі на пачатак 2006 года ў сярэднім на аднаго жыхара рэспублікі прыходзілася 580 тыс. рублёў зберажэнняў, размешчаных у банкаўскіх укладах, аблігацыях і ашчадных сертыфікатах, то на 1 студзеня 2007 года — 820 тыс. руб. У доларавым эквіваленце гэта складае 383 долары ЗША, што ў 1,4 раза больш, чым на адпаведную мінулагоднюю дату. Афіцыйны абменны курс да долара ЗША складзецца ў дыяпазоне 2090—2200 беларускіх рублёў за 1 долар, да расійскага рубля — 77,7—84,3 беларускага рубля за 1 расійскі рубель.

**Упраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка.**

## У ЖКГ праводзіцца ўзважаная палітыка па тарыфах для насельніцтва

**Аб гэтым заявіў на прэс-канферэнцыі міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Белахвостаў.**

Уладзімір Белахвостаў нагадаў, што для насельніцтва тарыфы на паслугі ЖКГ з 1 студзеня павышаны на $5 (на газ і электраэнергію — на 20 працэнтаў, на цяпло — на 12 працэнтаў).

Плата за двухпакаёвую кватэру ў зімовы перыяд у сярэднім складзе Br122 тыс., у летні — Br74 тыс. Кошт аднапакаёвай кватэры ў зімовы перыяд — Br81 тыс., у летні — Br49 тыс. Аплата трохпакаёвай складзе каля Br170 тыс. і Br101 тыс. адпаведна.

Гэта разліковыя лічбы, яны могуць быць меншыя, таму што ў жылым фондзе ўстаноўлены лічыльнікі і сістэмы рэгулявання спажывання энергіі, падкрэсліў міністр.

Паводле слоў Уладзіміра Белахвостава, пасля завяршэння ацяпляльнага сезона міністэрства будзе ўносіць прапанову аб павышэнні тарыфаў на ваду.

Міністр ЖКГ падкрэсліў, што ў 2007 годзе «ніякіх абмежаванняў па забеспячэнню насельніцтва камунальнымі паслугамі не будзе».

**БЕЛТА.**

Ва ўрадзе

## Вопыт Еўропы — на беларускія прадпрыемствы

**Беларускія прадпрыемствы выкарыстоўваюць вопыт Германіі і іншых краін Еўропы па энергазберажэнню, у прыватнасці, па ўкараненню біяэнергетыкі. Аб гэтым паведаміў у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА віцэ-прэм'ер Беларусі Іван БАМБІЗА.**

Для вывучэння перадавых тэхналогій і біяэнергетыкі была накіравана група беларускіх вучоных і спецыялістаў сельскай гаспадаркі на выстаўку «Зялёны тыдзень», якая праходзіла нядаўна ў Берліне.

У прыватнасці, вывучаўся вопыт укаранення біягазавых установак у Германіі. Гэта абсталяванне для выпрацоўкі цеплавой і электрычнай энергіі выкарыстоўвае біягаз, што атрымліваецца з біямасы, аснова якой — адходы вытворчасці жывёлагадоўчых ферм. Паводле слоў Івана Бамбізы, у бліжэйшы час у рэспубліцы з'явяцца ўласныя біягазавыя ўстаноўкі, выраблены па распрацоўках беларускіх вучоных. У бліжэйшыя два гады будзе арганізавана ўласная вытворчасць біягазавых установак, пераканаены Іван Бамбіза.

У бліжэйшыя два-тры гады ў большасці раёнаў рэспублікі міні-ЦЭЦ будуць працаваць пераважна на драўнянай сыравіне.

Айчынныя прадпрыемствы павінны выкарыстоўваць таксама энергію зямлі, атрымліваючы з нетраў цеплавую энергію. Доля мясцовых і альтэрнатыўных крыніц энергіі ў паліўна-энергетычным балансе рэспублікі да 2012 года павінна скласці не 25 працэнтаў, як планавалася, а больш як 30 працэнтаў, адзначыў ён.

**Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.**

## Новыя памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў

Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ўстаноўлены памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў у цэнах снежня 2006 года для 18 сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла начальнік упраўлення комплексных праблем развіцця сацыяльна-працоўнай сферы Мінпрацы і сацабароны Тамара Рак. Гэтыя нарматывы будуць дзейнічаць з 1 лютага па 30 красавіка гэтага года.

Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек з 1 лютага гэтага года складае Br265 тыс. 110 у разліку на месяц (дзеючы ў лістападзе 2006 года—студзені 2007 года — Br258 тыс. 570). Гэты сацыяльны нарматыў служыць асновай для вызначэння права на атрыманне льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў, на рамонт жылля для жыхароў малых населеных пунктаў.

Спецыяліст падкрэсліла, што ў параўнанні з цяпер дзеючым нарматывам (у цэнах верасня 2006 года) мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек павялічыўся на 2,5 працэнта.

## Беларускія вучоныя выкарыстоўваюць сусветны вопыт па энергазберажэнню

**Аб гэтым паведаміў у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

Абяцае быць цікавай рэалізацыя праекта на Жыткавіцкім радовішчы бурых вуглёў. Тут ужо разведана 150 млн. тон.

Міхаіл Мясніковіч сказаў, што на працягу бліжэйшых 5—7 гадоў можна будзе весці распрацоўку бурых вуглёў з тым, каб перапрацоўваць іх у аб'ёме 4—4,5 млн. тон у год. Для работы парку дызельных машын неабходна 2 млн. тон паліва. «Пры тэрмахімічнай апрацоўцы мы можам атрымаць з бурых вуглёў да 600 тыс. тон маторнага паліва. Гэта будзе рэальны ўклад у праграму энергазберажэння краіны», — падкрэсліў ён.

## МАРОЗНА!

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава, у выхадныя час ад часу зноў будзе ісці снег, месцамі з моцнымі завеямі. Тэмпература паветра ўначы ў гэтыя дні будзе вагацца ад 6 да 12 марозу, пры праясненнях месцамі да мінус 14—17 градусаў. У суботу 2—8 марозу, у нядзелю стане на 2—4 градусы халадней.

Да канца месяца будзе трымацца зімовае надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Аляксандр КОСІНЕЦ:
# «МЫ НЕ МАЕМ ПРАВА РАСПЫЛЯЦЬ СВОЙ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ»

**Якой павінна быць адукацыя ў XXI стагоддзі, каб забяспечыць працвітанне нашай дзяржавы? Сваё меркаванне на гэты конт выказаў на пасяджэнні калегіі Міністэрства адукацыі, дзе падводзіліся вынікі за 2006 год, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр КОСІНЕЦ.**

— У новым стагоддзі мы павінны перайсці да інавацыйнай адукацыі, якая карэнным чынам адрозніваецца ад адукацыі XX стагоддзя, сутнасць якой заключалася ў механічнай перадачы вучням гатовай сумы ведаў. Сёння вучні павінны самі шукаць веды, а настаўнік толькі іх накіроўваць, — патлумачыў віцэ-прэм'ер. — Зараз мы рыхтуемся да правядзення ў краіне канферэнцыі «Інавацыйная адукацыя — галоўны рэсурс эфектыўнай і канкурэнтаздольнай эканомікі Рэспублікі Беларусь», на якой вучоныя, педагогі і студэнты змогуць падзяліцца сваім вопытам у стварэнні сучасных высокатэхналагічных і навукаёмістых вопытна-канструктарскіх распрацовак. Я лічу, што пляцоўкай для дыскусій павінны стаць нашы прадпрыемствы, дзе ў студэнтаў і выкладчыкаў будзе магчымасць параўнаць айчынную прадукцыю з яе замежнымі аналагамі. Мы не імкнёмся быць першымі, але нельга дапусціць, каб хтосьці быў лепшым за нас — такой думкі павінен прытрымлівацца кожны.

Паводле слоў Аляксандра Косінца, летась на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі прайшла ўнікальная выстава, дзе былі прадстаўлены навуковыя распрацоўкі ВНУ — усяго 1563 экспанаты. Толькі вось ажыятажу з боку патэнцыяльных заказчыкаў чамусьці не назіралася. Больш таго, цікаўнасць да выставы праявілі літаральна адзінкі. Па выніках гэтага мерапрыемства быў выдадзены зборнік, у які ўвайшлі больш за паўтары тысячы навуковых і вопытна-канструктарскіх распрацовак. «Вось і прааналізуйце праз нейкі час, ці ёсць адчувальны эфект, бо мы ж не рабілі выставу толькі дзеля выставы, — звярнуў увагу прысутных Аляксандр Косінец. — Мы не маем права распыляць свой інтэлектуальны патэнцыял. Наша задача — выкарыстоўваць яго для развіцця Беларусі. Аб гэтым неаднаразова гаварыў і наш Прэзідэнт — Беларусі пашанцавала не толькі з яе геаграфічным становішчам, але і з магутным інтэлектуальным патэнцыялам».

**(Заканчэнне на 3-й стар.)**

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО БЕЛГОРХИМПРОМ!

**Внеочередное собрание акционеров состоится 9 февраля 2007 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 (актовый зал).**

***Повестка дня:***

1. О вхождении ОАО «Белгорхимпром» в состав Государственного научно-производственного объединения «Институт нефти и химии».

2. О передаче Наблюдательному совету права принятия решений по назначению генерального директора (членов дирекции) и определению условий оплаты труда генерального директора (членов дирекции).

**Регистрация акционеров с 10.00 до 12.30.**

Проект решения собрания по вопросам повестки дня находится по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, ком. № 616.

**Справки по тел. 234-77-24 ЗАЙЦЕВА Вера Васильевна.**

## ВЫЙГРЫШ — КАТЭДЖ ЗА 200 МЛН

**Жыхарка в. Селаўшчына, што пад г. Бяроза, купіла білет сотага розыгрышу латарэі «Суперлато» і выйграла катэдж пад Мінскам коштам 200 млн рублёў.**

Латарэйны білет Л. Гарноўская набыла на пошце ў цэнтры горада, ён там быў апошні. Цяпер рабочая завода ЖБВ і яе муж-прапаршчык хацелі б, каб выйгрыш выдалі ім грашамі. У Мінску паабяцалі паспрыяць гэтаму. Дарэчы, у Бярозе яшчэ адной жанчыне пашчасціла. Работніца мясцовага мясакамбіната выйграла аўтамашыну.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## БЕЛАРУСКІЯ ТЭНІСІСТЫ ВЫЙШЛІ Ў ФІНАЛ АДКРЫТАГА ЧЭМПІЯНАТУ АЎСТРАЛІІ ПА ТЭНІСУ

Максім Мірны і Вікторыя Азаранка выйшлі ў фінал змешанага разраду на адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі па тэнісу. Нашы спартсмены ў паўфінале аказаліся мацнейшымі за пару Франчэска Ск'явоне (Італія) — Юнас Б'ёркман (Швецыя) — 6:2, 6:3.

Самай вялікай сенсацыяй на турніры стала сустрэча нашых у 1/4 фіналу з амерыканскім дуэтам Боб Браян — Ліза Рэйманд, якія выступалі пад першым нумарам. Наша пара перамагла з лікам 6:2, 6:1. Такога паражэння ў сапернікаў яшчэ ніколі не было.

**БЕЛТА.**

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.01.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 140,00 |
| 1 еўра | 2 765,74 |
| 1 латвійскі лат | 3 965,53 |
| 1 літоўскі літ | 800,57 |
| 1 чэшская крона | 98,18 |
| 1 польскі злоты | 704,28 |
| 1 расійскі рубель | 80,58 |
| 1 украінская грыўня | 422,99 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 26,5575 |
| 10 UAH | 52,4199 |
| 1000 BYR | 12,3645 |
| EUR | 34,3176 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 26.01.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2210 / 2325 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ISSN 1990-763X

## ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ



Алена ДЗЕВОЙНА

РУБРЫКУ ВЯДЗЕ

# Аб аплаце бальнічнага

***Майму сыну шэсць месяцаў ад нараджэння. З верасня я выйшла на працу на поўную нагрузку, а муж аформіў на сябе водпуск па догляду дзіцяці да спаўнення сыну 3 гадоў і атрымлівае адпаведную дзяржаўную дапамогу. У 5-месячным узросце сын захварэў і я вымушана была легчы з ім у бальніцу на 6 дзён, паколькі сын яшчэ груднічок, а таксама і па той прычыне, што муж захварэў на грып. Да ўрача муж не звяртаўся, бо бальнічны яму б не далі, паколькі ён знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці. У бальніцы мне выдалі бальнічны лісток, але бухгалтэрыя яго не аплаціла. Дапамажыце разабрацца, ці правільна гэта.***

**І.Ф. КРАЛЬКО**, *Віцебская вобласць.*

Парадак выплаты дапамог па часовай непрацаздольнасці ўстаноўлены Палажэннем аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах, зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.09.1997 № 1290. Згодна з пунктамі 3 і 13 гэтага Палажэння, у выпадку хваробы дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў дапамога па часовай непрацаздольнасці назначаецца толькі асобе, якая знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці і працуе на ўмовах няпоўнага рабочага часу (не больш за палавіну месячнай нормы часоў) і на даму. Артыкул 16 гэтага Палажэння прадугледжвае выплату дапамогі іншым асобам, акрамя той асобы, што знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці, толькі ў выпадку яе хваробы на перыяд, на працягу якога гэта асоба не можа ажыццяўляць догляд дзіцяці, у межах тэрмінаў, устаноўленых Палажэннем.

Пунктам 59 Інструкцыі аб парадку выдачы лісткоў непрацаздольнасці і даведак аб часовай непрацаздольнасці, зацверджанай Пастановай Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 09.07.2002 № 52/97, устаноўлены парадак выдачы лістка непрацаздольнасці па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у выпадку хваробы асобы, якая знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці.

Згодна з гэтым пунктам, лісток непрацаздольнасці ў такіх выпадках выдаецца лечачым урачом асобы, якая знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці, па яе ўказанню іншай асобе, якая фактычна будзе ажыццяўляць догляд дзіцяці, на перыяд, на працягу якога захварэўшая асоба не можа сама ажыццяўляць догляд дзіцяці, у межах тэрмінаў, устаноўленых пунктам 22 Інструкцыі. Пры гэтым у лістку непрацаздольнасці ў радку «Від непрацаздольнасці» ўказваецца: «Догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у сувязі з хваробай асобы, якая знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці», у радку «Асобыя адзнакі» — прозвішча, імя, імя па бацьку асобы, якая знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці, дата нараджэння дзіцяці і яго імя.

Такім чынам, вашаму мужу, калі ён захварэў на грып, неабходна было своечасова звярнуцца да свайго лечачага ўрача, паколькі ад гэтага залежала як правільнасць афармлення лістка непрацаздольнасці на вас, так і назначэнне і выплата вам дапамогі па часовай непрацаздольнасці. Выключэнняў для матуль, якія кормяць немаўлят, гэтымі нарматыўнымі актамі не ўстаноўлена. Такія акалічнасці неабходна ўлічваць сям'і пры прыняцці рашэння аб тым, хто будзе знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці.

# «Адно акно» на АЗС

**У Лідзе ўведзена ў эксплуатацыю новая газавая аўтазаправачная станцыя. Яна не толькі аснашчана сучасным абсталяваннем і прыгожа выглядае, але і працуе па прынцыпу «аднаго акна».**

Станцыя прызначана не толькі для запраўкі аўтамабіляў звадкаваным газам. Акрамя гэтага, любы жыхар горада можа тут падаць заяўку на газавае абсталяванне, дакументацыю на падвод газу да дома і іншыя паслугі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Зорны паход БДПУ

**ВНУ, якая рыхтуе тых, хто будзе сеяць «разумнае, добрае, вечнае», мае старую і вельмі цікавую традыцыю — штогод студэнты і выкладчыкі выпраўляюцца ў Зорны паход.**

42 гады таму ўпершыню выправіліся ў паход на лыжах і з рукзакамі за плячыма 5 атрадаў БДПУ — такая вось своеасаблівая пяціканцовая зорка атрымалася. Гэткая сімвалічнасць і вызначыла назву мерапрыемства. Нягледзячы на тое, што сёлета было ўтворана 10 атрадаў, слаўную традыцыю ніхто не парушае. З цягам часу змянілася хіба што скіраванасць паходу: да традыцыйнай культурна-спартыўнай праграмы дабавілася прафарыентацыйная дзейнасць.

Адбор студэнтаў для Зорнага паходу ледзь не як для Фабрыкі зорак — такі ж жорсткі! Сёлета 5 атрадаў накіраваліся ў Асіповіцкі раён і столькі ж — у Пухавіцкі. Старт быў дадзены 23 студзеня ля помніка студэнтам і выкладчыкам БДПУ, якія загінулі ў часы Вялікай Айчыннай вайны, а завяршыцца ўсё дзейства 27-га.

За 5 дзён хлопцы і дзяўчаты паспяваюць зрабіць шмат карыснага: даюць канцэрты ў школах і Дамах культуры, праводзяць спартыўныя спаборніцтвы (нездарма дэвіз сёлетняга паходу «Здаровы я — здаровая краіна!»), аказваюць дапамогу ветэранам, ускладваюць кветкі да помнікаў, праводзяць выхаваўча-азнаямленчую, метадычную работу, а будучыя псіхолагі яшчэ наладжваюць шматлікія трэнінгі, семінары.

Некаторыя студэнты ўдзельнічаюць у паходзе ажно чацвёрты год запар — вядома ж, столькі ўражанняў! Іх не страшаць нават спартанскія ўмовы пражывання: адны абыходзяцца без гарачай вады, у кагосьці ўмовы на двары, а іншым даводзіцца начаваць у спальніках, праўда, не ў палатках, а ў спартыўнай зале той ці іншай школы. У Пухавічах, напрыклад, «зорачак» сустракалі нават з аркестрам!

**Ала МАЧАЛАВА.**

# ЛЕКАР І БАНКІР ТАРАНАЎ

Спецыяльна для «Звязды»

## Горацкі біяэнергатэрапеўт паставіў народнае знахарства на інтэлектуальную аснову

***(Працяг. Пачатак у нумары за 26 студзеня).***

### Праверана на сабе

Ён сам паверыў у свае здольнасці выпадкова. Як гавораць: не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Вырашыў пагабляваць у маці на гаспадарцы некалькі дошак, і ў адкрыты станок зацягнула руку. Спецыялісты ў Мінску не выключалі і ампутацыю. Потым сказалі, што яму ўдалося ўратаваць руку толькі дзякуючы спадчыннасці, моцнаму імунітэту, бо на цэлым «гектары» рванай бруднай раны не ўзнікла ні на іголку нагнаення. Тым не менш сітуацыя была цяжкая, і працэс папраўкі суправаджаўся дзікім болем, які было не суняць нават морфіем.

— Аднойчы, калі прачнуўся ноччу ад болю, паклаў здаровую руку на бінты і адразу нават не зразумеў: нібыта ток ходзіць па ране, — прызнаецца Валянцін Мікалаевіч. — А потым уцяміў, што праз колькі часу боль сціхае, і я магу ўрэшце заснуць. Потым у суседнім пакоі, дзе мы глядзелі тэлепраграмы, аднойчы ўбачылі маладую жанчыну з пабялелым тварам, якая няспынна хадзіла і калацілася. Яна ўсё паўтарала: «Ой, мамачка, не магу жыць са сваім болем, лепей мне памерці цяпер...». Я прапанаваў дапамагчы супыніць гэты пасляаперацыйны боль. Пасадзіў побач і стаў вадзіць рукой. Неўзабаве на яе твары з'явіўся румянец, потым яна сказала, што нічога не баліць, а потым ёй моцна захацелася спаць. Мы яе паклалі, а самі хвалюемся — што рабіць? А можа, мне адказваць давядзецца? Не, пульс добры, дыханне роўнае. Такое ўражанне, што спіць здаровы і шчаслівы чалавек. Яна да раніцы праспала як пшаніцу прадаўшы. А потым прыбегла да мяне: маўляў, дзякуй, не разумею, што зрабілі, але нічога не баліць, затое шмат сіл і энергіі. Вось так усё і пачалося.

Потым дапамог яшчэ адной жанчыне, якая, дарэчы, да гэтага казала, што не можа паверыць: маўляў, тут таблеткі не дапамагаюць, а павадзіць рукой — ці гэта лячэнне? Таранаў адказваў, што і сам з цяжкасцю ў гэта верыць. Але дапамагло і ёй. Затым здарыўся выпадак у курыльцы: дапамог маладому чалавеку, вось толькі прасіў яго адразу ж пайсці да ложка, калі захочацца спаць. А выявілася, што боль прайшоў і ў дзяўчыны, якая проста ўважліва назірала за працэсам на адлегласці некалькіх метраў.

— Вось толькі тады я сур'ёзна задумаўся, што ёсць нейкія механізмы ўздзеяння, ёсць псіхічная і біялагічная энергія, ёсць біяполе, — гаворыць Валянцін Мікалаевіч.

### Свая справа

Ён заняўся самаадукацыяй і стаў працаваць з літаратурай. Тлумачыць, што для тых, хто пачынае, самая сур'ёзная праблема — як у інфармацыйным сметніку знайсці рацыянальнае зерне. Але гэта ўменне прыходзіць з практыкай.

Валянцін Мікалаевіч у свой адпачынак наведваў у Мінску семінары па нетрадыцыйнай медыцыне. І ўрэшце закончыў Міжнародную акадэмію эніяпсіхалогіі (гэта навука пра энергаінфармацыйныя працэсы чалавека). Мае пасведчанні аб адукацыі. У медаль —знак лекара, які павінен даваць уладальніку моцную абарону. Таранаву распавядалі, што ў знак спрабавалі страляць з вінтоўкі, дык куля мяняе траекторыю... Праўда, сам ён гэтую выснову не правяраў.

Таранаў падкрэслівае, што ён не змешвае сваю банкаўскую працу і незвычайнае «хобі». Лекарства нашкодзіць карпаратыўным інтарэсам. Акрамя гэтага, гаворыць Валянцін Мікалаевіч, у Беларусі няма закона, на падставе якога можна афіцыйна шырока займацца лекарствам. У Расіі — іншая сітуацыя, там усіх здольных беларусаў расіяне залічаюць у свае рэестры і нават запрашаюць для лячэння высокапастаўленых чыноўнікаў.

Былі і да яго сур'ёзныя прапановы адкрыць сваю справу. Аднойчы банкір быў у камандзіроўцы ў Італіі, і ў гатэлі на беразе Адрыятыкі не змаўчаў, спытаўся ў гаспадара: чаму ён, заможны чалавек, не сочыць за здароўем жонкі — прыгожай францу865жанкі? Размаўлялі на нямецкай мове, некалькі слоў італьянец ведаў па-руску, і Таранаў яму пералічыў хваробы спадарыні. Назаўтра той вярнуўся толькі спытаць: адкуль пастаялец даведаўся пра дакладны дыягназ жонкі. Той, як мог, растлумачыў і прапанаваў дапамагчы, чым можа. На вачах мужа і дачкі жанчына пры лячэнні расслабілася і заснула. Сваякі не маглі паверыць, што гэта адбываецца з чалавекам, які пакутаваў ад хранічнай бяссонніцы і нават ноччу не спаў больш за некалькі гадзін.

Італьянец прапанаваў Таранаву стварыць пад яго лабараторыю. Абяцаў, што той стане заможным чалавекам з такімі здольнасцямі. Праўда, кантракт ён прасіў падпісаць адразу на пяць гадоў, бо надта вялікія пачатковыя выдаткі. Але ў Горках адзін сын завяршаў вучобу, другі паступаў, і Валянцін Мікалаевіч адмовіўся кінуць дома ўсе справы.

### Аднаўленне жыццёвай энергіі

— А вы можаце шаптаць, як ваш дзед?

— Сёння ва ўжытку іншыя тэрміны, — адказвае Валянцін Мікалаевіч. — Цяпер усе людзі разумеюць, што такое жыццёвая энергія, што такое экстрасэнсорыка. У 40-х гадах мінулага стагоддзя амерыканец Бур даказаў, што ў чалавека ёсць эфірны двайнік у тонкім матэрыяльным выкананні, які пастаянна з намі, сатканы нібыта кокан вакол нас. А сёння ўжо ёсць лабараторыі, якія фатаграфуюць гэта біяполе, аўру...

Можна сказаць, што Валянцін Таранаў аднаўляе жыццёвую энергію. Ён распавёў пра красамоўны выпадак. Дзяўчынка-падлетак, у якой не знайшлі ніякіх захворванняў, стала згасаць. Няма апетыту, зніжаецца вага, немаведама адкуль узяліся апатыя да жыцця і незразумелая стомленасць.

— І часта такое здараецца: нібыта чалавек у норме, а згасае і не могуць выратаваць, — каментуе лекар. — Прычына адна: страта жыццёвай энергіі. Цяпер з такім дыягназам даюць лісток непрацаздольнасці ў Еўропе, а ў нас — на сіндром хранічнай стомленасці глядзяць, як на падман, лічаць за шарлатанства. Гэта дзяўчынка пасля першага сеанса прачнулася і папрасіла есці. А пасля некалькіх аднавілася поўнасцю, закончыла школу, без усякага блату паступіла ў ВНУ, і ўсё ў яе добра.

Для Таранава размова можа ісці аб дапамозе людзям пры адной важнай умове — не нашкодзіць чалавеку, каб намаганні лекара, біяэнергатэрапеўта пайшлі ў падтрымку традыцыйнаму лячэнню.

— Калі ёсць схільнасць альбо здольнасць, ці, як я кажу, Божы дар, то чалавек не толькі мае права, але і абавязаны карыстацца ім дзеля людзей, — гаворыць Валянцін Мікалаевіч. — Памятаеце: ідзі, накладай рукі і лячы. І мне, напэўна, нельга інакш.

**А пра парады горацкага біяэнергатэрапеўта чытайце ў адным з наступных нумароў «Звязды».**

**Ілона ІВАНОВА,** *г. Горкі.*

## На конкурс апавяданняў

*Маёй прабабулі Юстыне, бабцы, чыя дабрыня асвятліла жыццё нашчадкаў, чыя ўмеласць дапамагла нараджэнню многіх дзетак-беларусаў, прысвячаецца.*

**Дзіўная доля і вялікае наканаванне нашых вясковых настаўнікаў, часцей — жанчын, дзяўчат, выкладчыкаў роднай мовы і літаратуры: захоўваць і несці ў свет святло і зачараванне матчынага слова, не забываць і доўжыць традыцыі і памяць продкаў. Пра гэта нам яшчэ раз нагадвае настаўніца Аліна Латыш.**

**Віктар КАЗЬКО.**

**Аліна ЛАТЫШ**

# БАБКА

Юстына нібы не малілася, а аб нечым дамаўлялася з Богам.

— Мне так страшна, мне так страшна, — гучаў у хаце глухі шэпт Марыйкі, унучкі. Юстына не чула яго.

Да нараджэння гэтага дзіцяці Юстына рыхтавалася асабліва старанна. З таго часу, як даведалася, што нявестка зацяжарыла. На свет павінен быў прыйсці яе першы ўнук. Або ўнучка. Прадаўжальнікі іх роду. З нараджэннем гэтага дзіцяці яна станавілася сапраўднай бабкай.

Бо прымаць нованароджаных — бабіць — маглі толькі тыя, хто стаў ужо бабуляй, каму перакуліла за 40. Яе ж пачалі запрашаць да парадзіх значна раней, калі сама яна была яшчэ ў жаночай сіле. І ўсё з-за суседкі Антосі.

Пайшлі яны ўдзвюх восенню ў журавіны. Назбіралі амаль па кошыку, як раптам Антося схапілася за спіну, ускрыкнула ад болю:

— Ой, не дайду дадому, напэўна, раджу. Як нажом хто паясніцу рэжа.

— Табе ж яшчэ рана, сама казала. Можа пройдзе зараз боль, — супакойвала яе Юстынка, дапамагаючы ісці.

Сяк-так выцягнуліся з балота на ўзгорак, тут і прылягла, стогнучы і кусаючы вусны, Антося.

— Не магу больш ісці. Не пакідай мяне, прашу. Я баюся заставацца адна. Здаецца, памру.

— Але ж я нічога не ўмею...

— Можа, хто падыдзе, тады і пакліча людзей. Толькі не пакідай мяне...

Юстынка, халадзеючы ад страху, клікала на дапамогу. Але ніхто не адгукаўся. Вёска адсюль была недалёка, за якую вярсту. Але як на тое, ніхто не ішоў.

Юстынку палохала адказнасць: у суседкі не было дзяцей. Раджала яна не раз, але дзіця было ці адразу мёртвае, ці памірала праз некалькі дзён: казалі, пупавіна абкручвалася вакол шыйкі і прыдушвала.

Юстына сядзела каля Антосі, то падкладала ёй лепш жакетку пад галаву, то гладзіла высокі жывот, чула — дзіця жывое, б'ецца. Нажом-складанчыкам зрэзала галінкі з бярозы і дуба, бо чула ад старых — на бярозе перараазаюць пупавіну ў дзяўчынак, каб былі белымі з твару і стройнымі, а на дубе — у хлопчыкаў, каб раслі моцнымі. Распарола рукаў сваёй кофты і выцягнула чырвоную нітку, каб перавязаць пуп. Супакойвала Антосю, а сама нячутна малілася, прасіла літасці ў Маці Божай...

Што рабіць? Яна не адзін раз дапамагала цяліцца карове. Можа і тут падобна? Але лепш бы хто падышоў...

На захадзе сонца Антося нарадзіла дзяўчынку — жывую, прыгожанькую. Юстынка закруціла яе ў свой фартух і падала маці, а сама, плачучы ад радасці, кінулася ў вёску па падводу. Праз тыдзень у Антосінай хаце былі хрэсьбіны, і хроснай маці была яна, Юстынка.

З лёгкай суседчынай рукі і стала яна бабіць. Прыязджалі па яе нават з суседніх вёсак, асабліва тады, калі роды зацягваліся. І перажывалі, што яна марудзіць, доўга збіраецца. Не ведалі, што яна, укленчыўшы перад абразамі, моліцца за дзіцятка, за маці. І толькі пасля гэтага, адчуўшы ўпэўненасць, сілу, збірала зёлкі для парадзіхі.

Ужо больш за дваццаць дзетак прыняла яна. І ўсе былі здаровыя, падрасталі.

Юстынка марыла больш пра ўнучачку. Бо самой дзяўчынак Бог не даў. Выжылі з усіх дзяцей, сталі дарослымі толькі два сыны. І то адзін ажаніўся, а другі далёка дзесьці на заробках.

Красавіцкай раніцай, гатуючы з нявесткай ежу, бабка па адной ёй вядомых прыкметах здагадалася: сёння. Сёння яна стане бабуляй. І клікнула мужа, які разам з сынам збіраўся ехаць араць:

— Вазьміце з сабой сала з хлебам, з'ясце ў полі. Кацярынка, відаць, не прынясе, не зможа. І пабудзьце ў полі як найдаўжэй.

На яго запытальны позірк позіркам адказала: так, напэўна сёння. А сыну нічога не сказала, бо звычай такі ў вёсках, каб як мага менш людзей ведала пра роды.

Але «сёння» не атрымалася. Мужчыны вярнуліся ўжо з цемнатой, у хату іх не пусцілі. Занепакоеная, узрушаная Юстынка падала ім даёнку, махнула рукой: «Неяк падоіце!». І дадала: «Мучыцца вельмі. Каб крычала, лягчэй было б...».

Кацярына не крычала. Саромелася. Ад болю закусвала вусны, кусала рукі.

Распляла валасы, развязала ўсе вузельчыкі на адзенні — тады, гавораць, хутчэй можна нарадзіць. Якіх толькі зёлак не заварвала Юстынка! Якіх толькі парад не давала! Адчувала бабка — дзіцятка жывое, але вялікае, вось і цяжка нявестцы.

Мужчын у хату нанач не пусціла. Есці ім вынесла на ганак. І сядзелі яны на ганку ўвесь вечар, смалілі табаку, а потым, узяўшы кажухі, пайшлі ў хлеў на сена.

Толькі на світанні ў хаце пачуўся дзіцячы крык. З вачэй бабкі, якая ледзьве трымалася на нагах, паліліся слёзы радасці: на яе руках была дзяўчынка, прыгожанькая і тоўсценькая. «Дзякуй табе, Святая Марыя, што ўсё шчасліва скончылася. Прашу: апякуйся душой гэтага дзіцяці...». Абмыўшы і закруціўшы ў пялюшкі ўнучачку, пабегла будзіць мужчын. Ды тыя ўжо не спалі.

— Пацалуй, каб заўсёды яе любіў, — паказала на падушачку побач з задрамаўшай Кацярынкай.

Сын наблізіўся да ложка, нахіліўся над скрутачкам і засмяяўся: малая не спала, глядзела проста яму ў вочы. Сустрэўся вачамі з жонкай, дакрануўся ўдзячна да яе рукі.

Малеча — а праз тыдзень яе ахрысцілі Марыяй — была на дзіва спакойная. Нікому не перашкаджала. Ціхенька ляжала ў люльцы, падвешанай у запечку, самым цёплым месцы ў хаце. Бабка не магла нацешыцца з яе...

* * *

Бабка адарвалася ад шчаслівых успамінаў і як быццам правалілася ў чарнату. Як даўно гэта было! Цэлых шаснаццаць гадоў таму. Перад ёй на пасцелі ляжала любімая ўнучка. Ляжала, як усе ведалі, на Божай пасцелі: дажывала апошнія дні. Дзяўчынка ўся гарэла ад жару: запаленне лёгкіх трымалася, хоць і да доктара за 30 км ездзілі, і банькі ставілі, і чым толькі ні націралі.

— Бабулька, чаму я цябе не бачу, толькі чую? У вачах зоркі мігаюць, — прашаптала хворая. Вочы яе былі шырока раскрытыя, але яна не бачыла бабку, глядзела ўверх.

— Галубка мая, ты стамілася, заснеш зараз — і жар спадзе, — усцішала яе бабка, гладзячы па гарачай — апячыся можна — ручцы.

— Не, бабулечка, я хутка памру, мне так страшна, — прашаптала Марыйка і страціла прытомнасць.

Юстына заходзілася нячутным плачам. Каб жа хто ведаў, як дакарала яна сябе, што адпусціла тады Марыйку на возера пакоўзацца. Тая і тады крыху кашляла. Але кашаль — частая хвароба ў сялянскай хаце. Пакашляе дзіця і перастане. Але на гэты раз Марыйцы стала горш.

Бабуля адыходзіць ад ложка ўнучачкі. Звыкла ўкленчвае перад абразамі. «Божа міласцівы, пачуй маю просьбу. Злітуйся над маёй унучачкай, аздараві яе. Ведаю, шмат Цябе прасілі пра гэта, усе вочы выплакалі мы, просячы Цябе. Але я не проста прашу. Я шмат пражыла, многа пабачыла. А яна ж яшчэ пупышачка. Ёй дзяцей нарадзіць трэба, унукамі пацешыцца. У мяне іх вунь колькі — калі і сваіх не шмат, дык многа тых, хто пры маёй дапамозе на свет прыйшоў. На Вялікдзень цэлае рэшата яек фарбую — кожны дзіцёнак бяжыць бабку павіншаваць, а я яму чырвонае яйка. Я для цябе, Божа, усё жыццё шчыравала. Вунь колькі дзетак Цябе славіць будуць, да Цябе пойдуць. Дай і маёй Марыйцы пахадзіць па зямлі. Але ты, Усемагутны, лепш за мяне ведаеш, што рабіць. Я толькі папрасіла, слабая і старая, а твая воля няхай будзе... Толькі калі ўжо так трэба, прыбяры лепш мяне».

Бабка павольна ўстала, падышла да хворай. Прыслухалася. Тая па-ранейшаму ўся гарэла, цяжка дыхала. Пайшла на свой ложак у запечку, усцягнулася на яго...

— Мамачка, мне есці захацелася!— уздрыгнула ранкам Кацярына ад Марыйчынага крыку.

Хворая сядзела ў ложку і ўсміхалася. Кацярына кінулася да яе, вуснамі дакранулася да дачкінага лба: жару не было.

Здзівілася, што за перагародкай не чуваць свекрыві: яна заўсёды ўставала яшчэ ў цемры.

Падышла да ложка Юстынкі. Тая ляжала нерухома, заплюшчыўшы вочы, быццам спала. Дакранулася да яе рукі — рука была ўжо халодная.

*г. Паставы.*

# Дні Індыі ў Беларусі

**Яны пачаліся ў Мінску з урачыстасці, прысвечанай святкаванню нацыянальнага свята гэтай краіны.**

Разам з індыйскімі дыпламатамі, членамі іх сем'яў, індусамі, якія сёння жывуць у Мінску, на вечарыну ў Дом дружбы прыйшлі прадстаўнікі таварыства «Беларусь-Індыя», дэпутаты Нацыянальнага сходу Беларусі — члены рабочай групы па супрацоўніцтву з Сансадам (парламентам) Рэспублікі Індыя. Кіраўнік групы, старшыня Пастаяннай камісіі па сацыяльных пытаннях Савета Рэспублікі Анатоль Новікаў адзначыў добрую дынаміку развіцця адносінаў паміж краінамі ў розных сферах, у прыватнасці, навукі, культуры і адукацыі.

А старшыня таварыства «Беларусь — Індыя», лаўрэат прэміі Джавахарлала Неру, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алег Роман лічыць гэту краіну адным з самых актыўных і паслядоўных нашых партнёраў у Руху недалучэння. Патэнцыял узаемавыгаднага супрацоўніцтва краін велізарны.

Правядзенне Дзён Індыі ў Беларусі ўжо стала добрай традыцыяй. У час Дзён ладзяцца выставы, канцэрты, вечарыны індыйскай паэзіі і танцаў. Звычайна праходзяць яны ў памяшканні Дома дружбы. Там днямі адкрылася выстава народнага мастака Беларусі, намесніка старшыні таварыства «Беларусь — Індыя» Георгія Паплаўскага.

У праграме Дзён — вечарыны, прысвечаныя выдатнаму грамадскаму дзеячу Індыі і паэту з сусветнай вядомасцю Рабіндранату Тагору, любімай музыцы сям'і Рэрыхаў, канцэрт індыйскіх танцаў і іншыя мерапрыемствы. Іх папулярнасць сярод мінчан сведчыць аб вялікай цікаўнасці беларусаў да культуры і традыцый Індыі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## Inter-ПОЛ

### ГАВАРЛІВЫХ БУДУЦЬ ШТРАФАВАЦЬ

**З наступнага месяца брытанскім вадзіцелям, якія карыстаюцца мабільнікамі хендс-фры, будзе пагражаць пракол у правах на 3 балы і штраф у памеры да 60 фунтаў, калі паліцыя прызнае, што яны не кантралявалі свой транспартны сродак.**

Больш жорсткія штрафы таксама будуць распаўсюджвацца на вадзіцеляў, якія карыстаюцца звычайнымі мабільнікамі. Кампанія супраць вадзіцеляў з тэлефонамі хендс-фры, якія згубілі кантроль над сваім транспартным сродкам, і, напрыклад, трапілі ў ДТЗ, адлюстроўвае ўпэўненасць многіх экспертаў па бяспецы ў тым, што ў вадзіцеляў адцягвае ўвагу ад дарогі не неабходнасць трымаць мабільнік, а размова. Акрамя штрафу на суму да 60 фунтаў і абавязковага праколу ў правах на 3 балы, паліцыя будзе мець магчымасць перадаць справу ў суд, а там максімальная сума штрафу для вадзіцеля легкавога аўто складае 1 тысячу фунтаў і 2,5 тысячы — для шафёра грузавіка, фургона ці аўтобуса. У той жа час кожны пяты аўтаўладальнік у Вялікабрытаніі прызнаў, што карыстаецца мабільнікам за рулём.

### ФАЛЬШЫВАЯ ЦЯЖАРНАСЦЬ

**Жыхар Паўднёвай Афрыкі апынуўся ў няёмкім становішчы з-за ўласнага глупства.**

Мужчына, якому спатрэбілася адпрасіцца з працы, прад'явіў у якасці ўважлівай прычыны медыцынскую даведку... ад гінеколага. Паперу вынаходлівы афрыканец узяў у сваёй сяброўкі, якая рэгулярна наведвала згаданага ўрача ў сувязі з цяжарнасцю. Калі начальства, азнаёміўшыся са зместам даведкі, са здзіўленнем даведалася, што 27-гадовы Чарльз Сібіндану нібыта цяжарны, незадачлівага прагульшчыка аштрафавалі за прад'яўленне фальшыўкі. Суддзя, які ўстанавіў для яго даволі мяккі прыгавор, пажартаваў у адрас мужчыны, параіўшы яму надалей не звяртацца да гінеколагаў без слушнай прычыны.

### КІНАЗОРКА ПАТРАБУЕ ПРЫЗНАЦЬ СВАЮ ХУДЗІЗНУ ЗДАРОВАЙ

**Актрыса Кіра Найтлі падала ў суд на газету The Daily Mail, якая апублікавала матэрыял, у якім фотаздымак зоркі «Піратаў Карыбскага мора» надрукаваны побач са здымкам загінулай ад анарэксіі дзяўчыны. У тэксце артыкула паведамлялася, што худзізна кіназорак наносіць урон маладым жанчынам, якія спрабуюць дабіцца такой жа стройнай фігуры.**

Юрысты Найтлі заяўляюць, што іх кліентка не пакутуе ні анарэксіяй, ні якім-небудзь іншым расстройствам харчавання. Актрыса мае намер дабіцца праз суд абвяржэння высновы, якая ўтрымлівалася ў артыкуле, што яна мае адносіны да смерці 19-гадовай Сафі Мазурак.

### БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫ

**У амерыканскім штаце Джорджыя прыгавораны за згвалтаванне мужчына, які правёў у турме 22 гады, прызнаны невінаватым пасля правядзення аналізу ДНК.**

У 1985 годзе Піт Уільямс быў прыгавораны да 45 гадоў пазбаўлення волі па абвінавачанню ў згвалтаванні жанчыны пад пагрозай зброі. Ды і пасля арышту мужчыны паведамлялася аб чатырох падобных злачынствах, аднак следства не прыняло пад увагу той факт, што выпадкі згвалтаванняў адбываліся і пасля затрымання Уільямса.

Сам абвінавачаны пастаянна казаў пра тое, што невінаваты, аднак дзве ахвяры апазналі ў ім свайго гвалтаўніка. Толькі на мінулым тыдні сталі вядомымі вынікі тэсту ДНК, якія поўнасцю знялі віну з Уільямса. Дзякуючы аналізу ДНК у ЗША ўжо рэабілітаваны і вызвалены 192 чалавекі, якія адбывалі тэрмін за злачынствы, якіх яны не ўчынялі, у тым ліку цяжкія.

**Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.**

## Ветраны млын аднаўляе фермер

Пройдзе некаторы час, і вецер закруціць лопасці млына, што з'явіўся недалёка ад пасёлка Мальча Светлагорскага раёна. Гэты ўнікальны помнік народна-этнаграфічнага дойлідства XIX стагоддзя быў перавезены са Жлобінскага раёна, дзе яго не ўдалося аднавіць. І тады за справу ўзяўся светлагорскі фермер Уладзімір Быхаўцоў, якому давялося пераадолець шмат перашкод і ўкласці нямала ўласных фінансавых сродкаў, каб ажыццявіць задуманае. Дапамагалі яму ў гэтай справе бабруйчанка Настасся Шарнікава, бацьку якой у 30-я гады належаў млын, куплены яго бацькам у Рэчыцы (першы, дарэчы, быў раскулачаны і ў 1938 годзе расстраляны), і загадчык кафедры архітэктурных і грамадскіх будынкаў БНТУ Сяргей Сергачоў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# Аддача навукі — Br126,3 млрд

**За мінулы год вучонымі Нацыянальнай акадэміі навук было створана звыш 90 перадавых тэхналогій, больш за 1,6 тысячы аб'ектаў новай тэхнікі, распрацавана каля 800 новых методык.**

Паводле слоў першага намесніка старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятра Віцязя, са студзеня па лістапад 2006 года беларускія вучоныя акадэміі падалі 468 заяў на аб'екты прамысловай уласнасці. У патэнтныя органы за межамі краіны было пададзена 14 заяў. Летась супрацоўнікі інстытутаў акадэміі атрымалі 424 ахоўныя дакументы на аб'екты прамысловай уласнасці, што ў 1,3 раза больш, чым год таму .Напярэдадні Дня беларускай навукі, які краіна адзначае заўтра, у будынку Нацыянальнай бібліятэкі прайшоў Рэспубліканскі сход навуковай грамадскасці.

**Інга МІНДАЛЁВА.**



Фота Максіма ГУЧАКА, БЕЛТА.

У лабараторыі малекулярнай генетыкі Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі распрацоўваюцца тэхналогіі стварэння трансгенных раслін важных сельскагаспадарчых культур (бульба, рапс, ячмень) для селекцыі новых гатункаў з гаспадарча-каштоўнымі прыметамі.

На здымку: малодшы навуковы супрацоўнік Ірына БЕРДЗІЧАВЕЦ займаецца вегетатыўным размнажэннем расліны ў культуры in vitro.




## Язык мой — вораг...

Чым адметны канец снежня пачатак студзеня, дык гэта безупынным святочным марафонам: каталіцкае Ражство, Новы год, Каляды, стары Новы год... І кожнае са святаў — асаблівае: вясёлае, чароўнае. І пагуляць можна, і паваражыць, і паштукарыць — суседавы вароты недзе занесці, руплівай гаспадыні шкло на комін палажыць, сані зацягнуць... на дах аўтобуснага прыпынку.

Цяпер за гэткія жартачкі можна і 15 сутак атрымаць, а калісь...

Аднаго дзецюка (на жарты непадатнага) хлопцы загадзя папярэдзілі, што «ў госці» прыйдуць. Той узяў добрага дрына, сеў у засцішку (у прыбіральні), чакае, пакуль з'явяцца, пакуль штукарствы свае распачнуць, каб тады выскачыць і добра-такі ўсыпаць...

На бяду яму — згледзелі хлопцы, дзе ён схаваўся... Падкраліся ціхенька. Ну, і... павалілі тую прыбіральню. Добра яшчэ, што дзверцамі ўверх...

Старому пуцейцу дзядзьку Антуку таксама нашкодзілі — дзесяць шпал на ганак прыцягнулі, а для надзейнасці — яшчэ і вадою іх палілі. Цётцы Марысі дзверы дратвай заснавалі — павук такой гусценькай павуціны не пляце. У Міхала веснічкі на другі канец вёскі занеслі...

Карацей — абышлі ўсю вуліцу, кожнаму нешта ўтварылі. Адна хата засталася — родная: там двое завадатараў жылі. Пачухалі яны патыліцы, кажуць:

— Трэба і сабе нешта ўтварыць, а то здагадаюцца людзі, чыіх рук справы... Давай нашы вароты да Марысі зацягнем.

...Раніца ў той дзень выдалася ў вёсцы шумнай: нехта некаму тэлефанаваў, нехта, не могучы вылезці з хаты, грукаў у дзверы, нехта вароты шукаў (або іх гаспадара), нехта ўсялякімі словамі сварыўся на выхадкі «хуліганскай» моладзі. «Моладзь» жа тая (у прыватнасці ў асобах двух братоў-падшыванцаў) бестурботна спала. Пакуль...

— Раман, уставай, — штурхануў бацька меншага. — Нехта вароты ў нас зняў... Кажуць, у Марысі ляжаць. То ідзі, сынок, прынясі.

— Паўлік занёс, — то ён і няхай забірае, — буркнуў спрасонні брат і... зразумеў, што сам сябе выдаў.

**Ніна РЫБІК,** *г. Астравец.*

## Чужымі рукамі...

Наша вёска Падліпцы раскінулася ну, зразумела ж, пад ліпамі, з поўначы на поўдзень, уздоўж ракі. Даўнія жыхары яе займаліся пчалярствам. Мёд іх вельмі славіўся, бо быў лекавы — ліпавы. У такога — аматараў пачаставацца заўсёды шмат.

Неяк каля вёскі пасяліліся цыганы. І калі ў іх нарадзілася малое, папрасілі аднаго з пчаляроў быць за кума. Згадзіўся той. Але ж нажыў сабе дадатковы клопат: бацька таго дзіцяці не-не ды і ўваліцца ў хату, папросіць мёду. Раз пачаставалі яго, два, тры — добра чужымі рукамі жар заграбаць — прыходзіць у чацвёрты. Не вытрымаў пчаляр, кажа:

— Вось на гэтай ліпе — калода з мёдам. Забірай.

— А як? — пытаецца цыган.

— Вось лесвіца, залазь...

Цыган, не доўга думаючы, шусь наверх. А там... Як наляцелі пчолы... Карацей — уніз ён «шаснуў» куды хутчэй. І мёду ў пчаляра не прасіў больш ніколі.

**Міхаіл Фёдаравіч ЯНКОВІЧ,** *в. Падліпцы, Слуцкі раён*

## Выхоўваем... А хто каго?

Па тым часе гэта было надзвычайным здарэннем — шасцікласнік, падчас зімовых канікулаў, выпіў гарэлкі і п'яны бадзяўся па вёсцы.

Гэту «навіну» мясцовае сарафаннае радыё ў той жа дзень данесла класнаму кіраўніку. І той ужо сабраўся з думкамі, каб пагаварыць з вучнем. Але потым рашыў, што толку будзе болей, калі тое ж зробіць дырэктар школы. Аўтарытэт, як ніяк, хоць, на жаль, і падмочаны. Якраз тым самым — гарэлкай...

Рашэнне, аднак, было прынята: вучня выклікалі ў кабінет. Дырэктар пачаў выхоўваць. Гаварыў, гаварыў, гаварыў... Пытае нарэшце:

— Ёсць пытанні?

— Ё.

— Задавай.

— А чаму некаторым можна выпіваць кожны дзень, а мне — нават на Новы год нельга?

...Хто сказаў, што дарослыя выхоўваюць дзяцей?

Дзеці дарослых — таксама. І невядома яшчэ, хто каго болей.

**Іван Іванавіч ЛАСІЦКІ,** *в. Дворышча, Лідскі раён*

## Слова лечыць. І калечыць — можа таксама

Гэта «прыгода» адбылася з маёй прабабуляй, калі яна трапіла ў бальніцу. Там яе абследавалі, трохі падлячылі.

— Усё, — кажа доктар, — можаце ісці дадому.

— Не, бабулька, пачакайце, — з парога крычыць медсястра. — Мы забыліся вам чэрап зняць!

— А Божа ж мой! А дзетачкі... Лепш я памру ці хворай застануся... Як жа — без чэрапа? Нашто яго здымаць?

— Выбачайце, бабулька, — гаворыць медсястра, — я не так сказала. — Мы сасуды галаўныя прасвятліць вам збіраліся...

— Дык ты, любачка, так і кажы... У наступны раз. А то надумалася — «чэрап зняць»...

Такім чынам галава ў прабабулі засталася на месцы. Але ў бальніцу ехаць яна болна не хоча.

**Сяржук ЧЫЛІКІН-САДЭЛЬСКІ,** *г. Мінск*

## Складаная задача

Было гэта гадоў пятнаццаць назад. Збылася мара «ідыёта» — я купіў домік у вёсцы. Месца — казачнай прыгажосці, але і папрацаваць трэба было, каб прывесці яго ў парадак. Пачаў з самага неабходнага, з будаўніцтва прыбіральні: параіўся з мясцовымі мужыкамі, дзе паставіць, з чаго пабудаваць. Майстроў знайшоў. А для пачатку, мне сказалі, яму трэба выкапаць.

На гэта, як вядома, розуму шмат не трэба, хапіў я рыдлёўку, адмераў метраў 15 ад хаты, і давай махаць. Сіла ёсць, надвор'е добрае, душа пяе. Дарваўся, карацей, як дурны да лыжкі: ледзь не па грудзі выкапаў (пры маіх 180), памер — два на паўтара.

Суседка прыходзіць, стала на пясочку, на «беразе», зверху пазірае і разважае ўслых:

— Сцяпанавіч, а што гэта ты — склеп капаеш? Дык, а чаму так далёка ад хаты? Возьмуць ды пакрадуць яшчэ што...

— Не, кажу, Бярнардаўна, вось тут — не пакрадуць нічога: тут яма будзе. Пад прыбіральню.

— Суседзе, — рукі зложыла яна, — а на халеру ж такая вялікая?

— Ну, — тлумачу, — каб не на год, каб надоўга хапіла.

Пагледзела бабуля, падумала і за галаву як хопіцца:

— А людцы ж мае... Дык гэта ж колькі дабра трэба праз зубы прапусціць, каб гэткую яму запоўніць?!

...Праўду казала: 15 гадоў «прапускаем». І ўсё яшчэ месца шмат.

**У. С.,** *г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# «МЫ НЕ МАЕМ ПРАВА РАСПЫЛЯЦЬ СВОЙ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вясной гэтага года ў Мінску пройдзе канферэнцыя «Адукацыя — без межаў», скіраваная на аднаўленне сувязяў з замежнымі грамадзянамі — выпускнікамі беларускіх ВНУ. Экспарт адукацыйных паслуг аб'яўлены адным з прыярытэтаў беларускай дзяржаўнай палітыкі. У гэтым навучальным годзе ў Беларусі атрымліваюць адукацыю каля 6740 замежных грамадзян (уключаючы краіны СНД і Балтыі). Віцэ-прэм'ер прывёў у якасці прыкладу ЗША, дзе навучаюцца 537 тысяч замежных грамадзян. Непасрэдны даход ад экспарту адукацыйных паслуг дасягае ў Злучаных Штатах 12 мільярдаў долараў і 8 мільярдаў складае ўскосны даход.

— Мы павінны выкарыстоўваць магчымасці нацыянальнай школы для падрыхтоўкі замежных грамадзян, — падкрэсліў Аляксандр Косінец. — Курыруючы міжурадавую камісію па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву з Туркменістанам, я на практыцы пераканаўся, якія дывідэнды можа прынесці сувязь з нашымі выпускнікамі. Высветлілася, што міністр сельскай гаспадаркі і харчавання гэтай краіны з'яўляецца выпускніком беларускай сельгасакадэміі. Мы выйшлі на яго і вось вам вынік — у гэтым годзе мы адпраўляем 2 тысячы беларускіх трактароў. Людзі, якія калісьці вучыліся ў Беларусі, радуюцца, калі мы іх знаходзім. А мы за дзесяцігоддзі страцілі з імі ўсе кантакты. Многія з выпускнікоў беларускіх ВНУ займаюць у сябе на радзіме вядучыя пасады і пазіцыі. Аднаўленне сувязяў дапамагло б нам умацаваць нашы пазіцыі на міжнароднай арэне і стварыць умовы для эканамічнага росту.

У сваім выступленні віцэ-прэм'ер закрануў яшчэ некалькі вельмі важных і прынцыповых пытанняў. Напрыклад, тэму размеркавання.

— Сёння мы імкнёмся прадастаўляць першае працоўнае месца ўсім, а не толькі студэнтам бюджэтнай формы навучання, — паведаміў Аляксандр Косінец. — Летась 8 працэнтаў бюджэтнікаў не даехалі да месца размеркавання. А са студэнтаў-платнікаў скарысталіся прапанаваным ім першым працоўным месцам толькі 20 працэнтаў. А дзе дзеліся астатнія 80 працэнтаў? Для падрыхтоўкі кадраў прафесарска-выкладчыцкі састаў прыкладае каласальныя намаганні. Хачу праінфармаваць, што сярэдні па краіне кошт навучання ў ВНУ складае 940—970 долараў ЗША ў год, у той час як навучанне аднаго «бюджэтніка» абыходзіцца дзяржаве ў 1477 долараў ЗША. Толькі паглядзіце, якія прэферэнцыі мы даём студэнтам платнай формы навучання — дзяржаўная дапамога складае штогод больш за 500 долараў на кожнага. І яны павінны гэта ведаць...

Сёння рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя для будаўніцтва студэнцкай вёскі, разлічанай на размяшчэнне 10—11 тысяч чалавек. Архітэктурны праект быў распрацаваны раней. У першую чаргу ў вёску пераедуць студэнты інтэрната БДУ, размешчанага на праспекце Пераможцаў. Знойдзецца там месца для студэнтаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, БНТУ і іншых. Акрамя таго я зараз вяду перамовы з Міністэрствам абароны аб перадачы комплексу збудаванняў у ваенным гарадку ва Уруччы, якія пасля рэканструкцыі можна будзе аддаць навучальным установам для засялення студэнтаў.

Вельмі актуальнай застаецца для айчыннай сістэмы адукацыі і праблема высокай захворваемасці дзяцей. З кожнай сотні дзятвы толькі 27 чалавек можна лічыць цалкам здаровымі, а 73 чалавекі маюць тыя ці іншыя адхіленні ў стане здароўя. «Давайце сур'ёзна прааналізуем, а якія ў нашых дзяцей праграмы, які расклад заняткаў, ці ёсць перагрузка, якая парта ў школьнікаў, якое харчаванне», — заклікаў віцэ-прэм'ер.

На думку міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, праблема аптымальных вучэбных праграм — гэта праблема не толькі прафесійная, але і сацыяльная:

— Задача па вызначэнню аптымальнай нагрузкі школьнікаў — не з разраду лёгкіх. І ў гэтым плане шмат залежыць ад саміх бацькоў. Не ўсе дзеці могуць вывучаць той ці іншы прадмет на павышаным ці паглыбленым узроўні. Але задача педагогаў заключаецца ў тым, каб дапамагчы бацькам вызначыць адзіна правільны шлях, які б дазволіў іх дзіцяці цалкам самарэалізавацца. Я лічу, што сфера адукацыі — самая сацыяльна напружаная, напэўна, нават у большай ступені, чым ахова здароўя, паколькі для кожнага з бацькоў яго дзіця — гэта галоўная каштоўнасць,— патлумачыў сваю думку міністр.

Мінулы год, паводле ацэнкі Аляксандра Радзькова, аказаўся для беларускай сістэмы адукацыі вельмі напружаным, але паспяховым: сістэма агульнай сярэдняй адукацыі атрымала Закон Рэспублікі Беларусь «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», указам кіраўніка дзяржавы былі зацверджаны доўгатэрміновыя Правілы прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, быў праведзены фінал рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года», упарадкаваны парадак усынаўлення беларускіх дзяцей, у тым ліку і замежнымі грамадзянамі, з дзяржаўных пазіцый перагледжана ідэалагічнае напаўненне адукацыі, арганізаваны маніторынг якасці навучання і выхавання, распрацавана галіновая праграма «Электронны падручнік», створаны электронны банк даных адоранай моладзі, які ўключае інфармацыю аб 1989 выпускніках, уведзены ў дзеянне новы пералік вучэбных спецыяльнасцяў і кваліфікацый для ўстаноў прафтэхадукацыі, школьнікі перайшлі на дзелавы стыль адзення, важны крок быў зроблены па стварэнню з Расійскай Федэрацыяй адзінай адукацыйнай прасторы і г.д.

На міжнародных школьных алімпіядах з 27 членаў зборных каманд 20 чалавек вярнуліся дамоў з узнагародамі, папоўніўшы «скарбонку» беларускай школы 2 залатымі, 9 сярэбранымі і 9 бронзавымі медалямі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Еўропа працягне руку Беларусі для супрацоўніцтва

**Такую думку выказаў у інтэрв'ю FM-радыёстанцыі «ЮНІСТАР» палітолаг Аляксандр Рар, які падрыхтаваў інтэрв'ю з Прэзідэнтам Беларусі для нямецкай «Die Welt».**

Аляксандр Рар лічыць, што Беларусь і Захад — «у пачатку вельмі асцярожнага новага дыялога, новых узаемаадносінаў, новага набліжэння адзін да аднаго». «Думаю, у абодвух бакоў ёсць у гэтым напрамку перспектывы», — сказаў ён.

Дзелячыся ўласнымі ўражаннямі, палітолаг падкрэсліў, што кіраўнік беларускай дзяржавы «сапраўды вельмі адкрыты чалавек, вельмі незвычайны прэзідэнт і ў адносінах, і ў аргументацыі». «Мне было з ім надзвычай цікава гаварыць больш як дзве гадзіны. Інтэрв'ю доўжылася гадзіну, потым мы яшчэ размаўлялі сам-насам пра беларуска-еўрапейскія адносіны, пра тое, што чакае Беларусь у Еўропе», — дадаў Аляксандр Рар.

**БЕЛТА.**

### Доктар адкажа

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**На наступным тыдні асноўную нагрузку на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) возьмуць на сябе:**

**29 студзеня** — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Ірына Уладзіміраўна КАРНЯЛЮК.

**30 студзеня** — намеснік дырэктара НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Аляксандр Сергеевіч ПЯТКЕВІЧ.

**31 студзеня** — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы Павел Іосіфавіч САЛАДУХА.

**1 лютага** — галоўны ўрач 21-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Вячаслаў Станіслававіч СІЛЬЧАНКА.

**2 лютага** — галоўны ўрач 11-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска Людміла Паўлаўна ЛАЗУТА.

У графіку магчымыя змяненні.

## МЫТНЫЯ ТРЫЛЬЁНЫ

**Адбылося пасяджэнне калегіі Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) Беларусі, на якім былі падведзены вынікі працы айчынных мытнікаў за мінулы год.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе ДМК, на калегіі было адзначана, што мытныя органы па-ранейшаму актыўна напаўняюць дзяржаўны бюджэт. Летась мытнікі пералічылі ў даход нашай краіны 4 трыльёны 807 мільярдаў рублёў, што ў 1,33 раза больш, чым у 2005 годзе. Плённа працаваў і праваахоўны блок мытні. Супраць кантрабандыстаў і іншых парушальнікаў закона было ўзбуджана 36 крымінальных спраў, выяўлена каля 15 тысяч адміністрацыйных правапарушэнняў. Апроч таго прадухілены шэраг спробаў незаконнага ўвозу ў нашу краіну спіртазмяшчальных вадкасцяў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### Выставы

## Уладзімірцы супраць нафтагазавага канфлікту

**Такі дэвіз можна было б даць выставе мастакоў горада Уладзіміра «Родники Владимирской Руси», якая адкрылася ў зале Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці (Мінск, вуліца Гікалы, 4, бібліятэка імя Пушкіна) і будзе працаваць да 28 студзеня.**



Фота Крысціны КУЗЬМІНОЙ.

Асаблівасць экспазіцыі ў тым, што яе арганізатар — сродак масавай інфармацыі — Усерасійскі сацыяльны часопіс «Откровение».

— Калі эканамічныя сувязі паміж нашымі краінамі падвяргаюцца іспытам, то надыходзіць чарга сказаць сваё слова культуры, — так патлумачыў ідэю выставы галоўны рэдактар часопіса «Откровение» Аляксандр Пудзін (на здымку).

Прыватны часопіс, якому сёлета спаўніцца 10 гадоў і які пазіцыяніруе сябе як незалежная прэса Расіі, прапанаваў удзел у выстаўцы ўсім уладзімірскім мастакам. І паказаць свае творы беларусам, выказаць тым самым сваю павагу і сімпатыю пажадалі многія, як сталыя, вядомыя за межамі Расіі, майстры, так і маладыя, пачынаючыя мастакі.

Выстава атрымалася цікавая і разнапланавая. На ёй можна ўбачыць і лакавую мініяцюру на дрэве Леаніда Ярохіна «Дынастыя Раманавых», і творы «гросмайстра акварэлі» Віктара Шамаева, і марскія пейзажы на камянях, якія калісьці дапамаглі выжыць сям'і школьнага настаўніка Юрыя Пяцеліна. Тут і нацюрморты з жоўтымі, нібы згусткі сонечнага цяпла, грушамі, і знакамітыя белакаменныя ўладзімірскія храмы, якія нечым нагадваюць старажытныя Полацкія, і дзіўныя сярэднярускія пейзажы, з нейкім сваім асаблівым няўлоўным адрозненнем ад беларускіх... Усяго ў акцыі ўзялі ўдзел 13 мастакоў. Дарэчы, выстава гэта з'яўляецца і выставай-продажам, усе творы, акрамя аднаго, можна набыць у памяць аб Уладзіміршчыне. Той адзіны, які не прадаецца, з'яўляецца падарункам для залы, у якой адбываецца выстава. Гэта напісаны Юрыем Старадубцавым партрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## «ВІЛІЮ» ЗАЛІВАЛІ ВАДОЙ

**50 чалавек былі эвакуіраваны ўчора пад раніцу з гасцініцы «Вілія» ў Вілейцы.**

Як паведамілі рэдакцыі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, у 4.43 спрацавала пажарная сігналізацыя, выведзеная на пульт дзяжурнага гасцініцы. Датчыкі паказвалі, што на апошнім, чацвёртым, паверсе будынка з'явілася задымленне. Пакуль вахцёр выклікала выратавальнікаў-пажарных, дзяжурная кінулася наверх, дзе з пакояў ужо выбягалі жыльцы. Персанал гасцініцы пачаў эвакуацыю людзей, якія былі размешчаны ў кінатэатры «Мір». Дарэчы, пастаяльцы аднаго з нумароў самі сказалі, што менавіта ў іх і распачаўся пажар. Для ліквідацыі ўзгарання выратавальнікам-пажарным спатрэбілася пяць хвілін. Агнём у нумары былі пашкоджаны шпалеры, ложкі, тумбачка, стол. Да хуткага распаўсюджвання полымя прывяло тое, што ў пакоі была прыадчынена фортка, а, выбягаючы, жыльцы не зачынілі за сабой дзверы. Згодна з папярэднімі данымі, прычынай пажару стала неасцярожнае курэнне аднаго з іх: мужчына і жанчына, што прыехалі на адпачынак у Вілейскі раён, курылі абодва, і не адмаўляюць, што нечая цыгарэта і магла стаць крыніцай агню. Урон ад пажару склаў каля паўмільёна рублёў. Падчас здарэння ніхто з насельнікаў гасцініцы не пацярпеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА, Ігар ГРЫШЫН.**

### Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## Дзевам варта прыслухоўвацца да інтуіцыі, а Шалям — змяніць імідж

**АВЕН**. Справы, якія пачынаюцца на гэтым тыдні, могуць развaліцца без вашай у тым віны, таму не перанапружвайцеся самі і не заводзьце навакольных. Адпачніце і аднавіце сілы, калі ёсць магчымасць. У сераду новыя знаёмствы могуць несці непрыемны працяг, так што абмяжуйце кантакты і абараняйцеся ад чужога ўздзеяння. У пятніцу зможаце дабіцца добразычлівасці лёсу, але ў адказ ад вас спатрэбіцца нямала — набрацца рашучасці для сур'ёзнага кроку. Субота можа быць звязана з атрыманнем новых ведаў.

**ЦЯЛЕЦ**. Спрабуючы звярнуць горы на сваім шляху, вы можаце крыху не разлічыць і пераацаніць свае сілы. Больш цікаўцеся праблемамі сваіх калег і падначаленых — тады вашы намаганні не прападуць дарэмна. Ад сітуацыі, якая склалася, згодна з прадказаннямі зорак, толькі выйграеце. Не трэба вінаваціць сябе ў тым, што змяніліся адносіны з некаторымі калегамі, бо вашым поспехам зараз можна толькі пазайздросціць. Настае спрыяльны час для тых, каму неабходна перайсці на новую работу. Шукайце — і знойдзеце. Аўторак і серада ўдалыя для рашэння важных спраў, падпісання дамоўленасцяў, знаёмства з новымі партнёрамі. Пачынайце асвойваць новыя камп'ютарныя праграмы — гэта можа аказацца сур'ёзным момантам у прасоўванні па службовай лесвіцы. Вандроўка за горад разам з сябрамі дазволіць адцягнуць увагу ад дробных праблем.

**БЛІЗНЯТЫ**. Неабходна цвёрда стаць на ногі і пачаць маштабнае наступленне практычна ва ўсіх жыццёвых сферах. Падтрымка начальства ці вышэйстаячых інстанцый дазволіць пазбавіцца ад варожасці і інтрыг. У чацвер вас парадуюць навіны. У суботу зоркі прадказваюць вам татальную занятасць: вы самі не пакінеце сабе ні хвілінкі вольнага часу, будуючы планы і ставячы перад сабой новыя мэты. А вось нядзелю лепш цалкам прысвяціць сапраўднаму адпачынку.

**РАК**. Можна парадавацца вашым кар'ерным поспехам. Вы абкружаны людзьмі, якія гатовы многае зрабіць для вас і разам з вамі — але толькі не за вас. Панядзелак удалы для паездак і падарожжаў, камандзіровак і пераездаў. У гэты дзень вам спатрэбяцца такія якасці, як цярплівасць, стрыманасць і памяркоўнасць. У аўторак верагодна паступленне новай інфармацыі, якая вас зацікавіць. Другая палова тыдня будзе больш спакойнай і гарманічнай. У нядзелю вырашацца многія фінансавыя праблемы.

**ЛЕЎ**. Не варта рабіць лішніх рухаў. Мітусня толькі стоміць, а разважлівасць дапаможа ў многім разабрацца. Беражыце здароў'е, але не расслабляйцеся зусім. У сераду не здзіўляйцеся думкам філасофскага характару — дзень прыдатны для роздуму і духоўнага росту. У пятніцу магчымыя трэнні ў адносінах з дзелавымі партнёрамі не па вашай віне. Дачакайцеся, пакуль страсці ўлягуцца, і захапіце ініцыятыву ў свае рукі.

**ДЗЕВА**. Будзьце больш прадбачлівымі, не пераацэньвайце сваіх магчымасцяў у пачатку тыдня. У панядзелак можа падацца, што вы з усім справіцеся, але вынікі дня, верагодна, расчаруюць вас. Тыдзень спрыяльны для дзелавых паездак, сустрэч і падарожжаў. У чацвер проста неабходна прыслухацца да голасу інтуіцыі: яна падкажа, як правільна зрабіць выбар. У гэты дзень вы зможаце лёгка вырашыць любую праблему самастойна. У суботу варта не толькі планаваць, але і пачынаць рэалізоўваць задуманае.

**ШАЛІ**. Поспех будзе спадарожнічаць вам. Удзяляйце сабе больш часу. Зараз можна дазволіць сабе многае — нават раптоўнае змяненне іміджу ці патаканне асабістым капрызам. Магчыма прасоўванне па службе — пры ўмове, што вы праявіце мудрасць і дыпламатычнасць. У панядзелак старайцеся пазбягаць канфліктнай сітуацыі. У аўторак лепш не трапляць на вочы начальству, а важную размову з ім пажадана запланаваць на чацвер. У пятніцу не варта рызыкаваць: беражыце здароўе, пастарайцеся захоўваць асцярожнасць. У выхадныя вас парадуюць сустрэчы з блізкімі людзьмі, прагулкі за горад і цікавыя сустрэчы з сябрамі.

**СКАРПІЁН**. Вас можа атакаваць куча ідэй і праектаў, аднак большасць з іх, верагодна, акажуцца нежыццяздольнымі і адарванымі ад рэальнасці. У чацвер можа з'явіцца жаданне пачаць усё спачатку: ці вы вырашыце кардынальна змяніць імідж, ці перабудаваць дом, ці бязлітасна выкінуць усё, што назапашвалася гадамі. Пятніца можа парадаваць вас нечаканымі прыбыткамі ці знаходкамі. У суботу з'явіцца магчымасць прымяніць тэарэтычныя веды на практыцы — і вынікі вельмі парадуюць вас.

**СТРАЛЕЦ**. З'явіцца рэальная магчымасць для карэкцыі свайго лёсу, унясення ў яго чагосьці новага, незвычайнага. Даверцеся голасу сваёй інтуіцыі — і яна вас не падвядзе. Калі ў планах вы ўдзеліце належную ўвагу інтарэсам дзелавых партнёраў, гэта спрыяльна адаб'ецца на вашым аўтарытэце. Высокі творчы патэнцыял, але ці ёсць час яго рэалізаваць? Пастарайцеся не звязваць сябе ніякімі абяцаннямі — будзьце больш абачлівымі, каб пазбегнуць непаразуменняў. Калі збіраецеся ў адпачынак, то яго добра правесці ў камфортным для вашага светаадчування месцы. У нядзелю нічога новага лепш не пачынаць. Займіцеся паўсядзённымі справамі — пачатымі, незавершанымі, менш важнымі, неістотнымі.

**КАЗЯРОГ**. Па ўсіх прыкметах, вы на парозе вялікіх перамен. Настае складаны і адказны тыдзень. Некаторыя прадстаўнікі знака рашацца на кардынальную змену знешняга выгляду: калі зрабіць гэта з розумам, то такое рашэнне, несумненна, пойдзе толькі на карысць. У чацвер многае можа раздражняць і выводзіць з сябе, і справіцца з эмоцыямі будзе цяжка. Пастарайцеся, каб ад праяўлення пачуццяў не пацярпелі навакольныя. У пятніцу лепш узяць ініцыятыву ў свае рукі, хутка прымаць рашэнні і даводзіць тое, што пачалі, да канца. У нядзелю не варта настойваць на сваёй праўдзе, бо бяскрыўдная спрэчка можа закончыцца сур'ёзнай.

**ВАДАЛЕЙ**. Ваша актыўнасць будзе блізкай да крытычнай. Супакойцеся — ад гэтага павысіцца агульны тонус і палепшыцца настрой. Парада, атрыманая ад блізкага сябра, дапаможа знайсці выйсце з тупіковай сітуацыі. У сераду поспех будзе залежаць ад зацікаўленасці ў выніку і гатоўнасці праявіць ініцыятыву. У чацвер вы бліскуча справіцеся з цяжарам наспелых праблем. Пятніца можа прынесці нечаканую свабоду дзеянняў, аб якой пасля давядзецца пашкадаваць, — трымайце сябе ў руках.

**РЫБЫ**. Варта заняцца сваёй знешнасцю: гэта добры час для абнаўлення іміджу. Можа з'явіцца шмат жадаючых стаць вам сябрам — на ўсякі выпадак не дапускайце іх да сябе занадта блізка. У панядзелак напор і энергія могуць пацягнуць за сабой дастойны вынік. У аўторак, радуючыся паспяховым дзеянням, вы можаце прыняць недастаткова прадуманае рашэнне. Некаторая падазронасць і недаверлівасць у сераду будзе цалкам апраўданай, бо вашы тайныя нядобразычліўцы могуць будаваць планы супраць вас. У чацвер зможаце ажыццявіць самыя смелыя ідэі.

## У Беларусі летась выдадзена 5,3 кнігі і брашуры на аднаго жыхара

**Адпаведны паказчык 2005 года складаў 4,1. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Лапцёнак.**

Паводле яго слоў, у апошнія пяць гадоў намецілася ўстойлівая тэндэнцыя пашырэння асартыменту прадукцыі пры росце тыражоў. Так, у 2006 годзе выдадзена 11 тыс. 569 назваў кніжнай прадукцыі тыражом 52 млн. экзэмпляраў, што на 7,3 працэнта і 29 працэнтаў больш, чым у 2005 годзе. На беларускай мове выпушчана 827 назваў кніг і брашур тыражом 4,56 млн. экзэмпляраў, што ў параўнанні з мінулым годам менш па назвах на 16,6 працэнта, але больш па тыражу на 57 працэнтаў. Літаратура на беларускай мове займае 7 працэнтаў ад усёй колькасці выпушчанай у рэспубліцы выдавецкай прадукцыі і 8,8 працэнта ад яе агульнага тыражу.

**Жанна КАТЛЯРОВА, БЕЛТА.**

## У панядзелак мусульмане ўзгадаюць Аўраама і Ісуса

А таксама ўсіх прарокаў, пачынаючы з Адама і заканчваючы Мухамадам — апошнім, згодна з Ісламам, прарокам, з ліку тых, хто прапаведаваў адзінага Бога. Гэты дзень у мусульманскім календары называецца Ашура, ён прыпадае на 10-ы дзень першага месяца мухарама (29 студзеня).

— Але гэта не свята, — патлумачыў старшыня Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі Абу-Бекар Шабановіч. — Гэта дзень памінання дзеянняў усіх пpaрокаў, якія былі да Ісламу. Гэты дзень прыпаў на час пераезду прарока Мухамада з Мекі ў Мадзіну, калі прарок трымаў пост. Лічыцца, што чалавек, які ўстрымліваецца ў Дзень Ашура, заслугоўвае даравання грахоў на працягу года.

Пазней да дня Ашура дадаўся Дзень смутку аб гібелі ўнука Мухамада імама Алі Хусейна — адна з найбольш важных дат для мусульман-шыітаў, якія ў гэты дзень прычыняюць самі сабе фізічны боль, каб лягчэй адчуць боль душэўны. Сёлета ў Дзень Ашура часовая мячэць у Мінску будзе прадстаўлена тутэйшым шыітам для малітваў і чытання Карана.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Самы масавы звер у Беларусі... бабер

**Паводле даных Мінпрыроды, прынятыя за апошнія пяць гадоў на дзяржаўным узроўні меры дазволілі стабілізаваць колькасць паляўнічых відаў дзікіх жывёл.**



Так, колькасць лася за гэты час павялічылася з 15,7 да 16,4 тысячы асобін (104,4 працэнта), аленя — з 4,6 да 5,5 тысячы (119,6 працэнта), казулі — з 50,4 да 52,2 тысячы (103,5 працэнта), дзіка — з 35 да 44 тысяч (125,6 працэнта). Колькасць рачнога бабра за дадзены перыяд павялічылася ў 3 разы і зараз яго папуляцыя налічвае каля 60 тысяч асобін. Як канстатуюць у Мінпрыроды, на жаль, гэты прыродны рэсурс паляўнічымі выкарыстоўваецца мала: штогод у краіне здабываецца не больш за 250 асобін бабра, што складае толькі 5 працэнтаў ад агульнай колькасці, у выніку чаго і паляўнічыя, і дзяржава нясуць значныя экалагічныя страты.

Адзначаецца станоўчая дынаміка росту колькасці рэдкіх відаў дзікай жывёлы: рысі, барсука, бурага мядзведзя. У шэрагу рэгіёнаў Беларусі сфарміраваліся ўстойлівыя папуляцыі гэтых дзікіх жывёл.

У 2006 годзе з Белавежскай пушчы былі пераселены ў паляўнічыя ўгоддзі Астравецкага і Лепельскага лесапаляўнічых гаспадарак 30 і 31 высакародных аленяў адпаведна. Такім чынам на тэрыторыі краіны створаны дзве новыя папуляцыі высакароднага аленя.

У 2006 годзе карыстальнікам паляўнічых угоддзяў было выдадзена каля 400 дазволаў на здабычу непажаданых відаў дзікіх жывёл. Нягледзячы на гэта, адзначаюць у Мінпрыроды, работа на месцах па здабычы лісы, янотападобнага сабакі, ваўка і іншых відаў арганізавана недастаткова. Так, толькі за апошні год колькасць ваўка ў краіне павялічылася на 26 працэнтаў, звычайнай лісы — на 17 працэнтаў, янотападобнага сабакі — на 13 працэнтаў.

У бліжэйшай перспектыве плануецца працягваць, у прыватнасці, работы па развядзенню дзічыны і рассяленню новых відаў дзікіх жывёл (лань, плямісты алень, муфлон і інш.), якія змогуць адыграць важную ролю ва ўзбагачэнні біялагічнай разнастайнасці краіны і якія могуць быць каштоўнейшымі аб'ектамі палявання ў справе развіцця паляўнічага і замежнага турызму.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### Інфарм-укол

## ПРЫ ПАНІЖАНЫМ ЦІСКУ — ДАЛОЎ МЯТУ

**І ў такой лекавай расліны, як мята ёсць свой шкодны бок.**

Гэта, праўда, не азначае, што трэба ўвогуле забыцца на чай з непаўторным водарам. Прыгадаем, што мята найперш — даволі моцны антысептык, яна валодае процізапаленчай і болесуцішальнай якасцямі. Яе ўздзеянне распаўсюджваецца на ўсе віды патагенных бактэрый страўніка. Каб зняць страўнікавыя колікі, дастаткова дадаць у звычайную заварку крыху мяты або замест чаю папіць збор з мяты, мацярдушкі і зверабою ў роўных частках (3 кубкі ў дзень). Перад цёплым мятным настоем адступаюць ікаўка, млоснасць, нястраўнасць і нават алкагольнае атручэнне. Аднак мяту не варта працяглы час ужываць людзям з паніжаным ціскам. Паніжаны тонус вянозных сасудаў можа справакаваць абвастрэнне варыкознага расшырэння вен. Мята проціпаказана пры цяжарнасці, спазмах у бронхах і тым, хто праходзіць курс гамеапатыі.

## ЧЫРВОНЫЯ ФРУКТЫ — МАЛАДАЯ СКУРА

**Дэрматолагі высветлілі: у людзей, якія ўжываюць шмат фруктаў і гародніны, да 40—50 гадоў маршчын значна менш, чым у тых, хто аддае перавагу мясу.**

У лідары выйшлі папрыка, тамат і ружовы грэйпфрут. Справа ў тым, што свабодныя радыкалы (рухомыя малекулы кіслароду) выклікаюць шкодныя акісляльныя рэакцыі ў арганізме. Гэта і прыводзіць да заўчаснага завядання скуры. Але звязваць свабодныя радыкалы дапамагаюць антыаксіданты — вітаміны А, С, Е і некаторыя ферменты, на якія багатыя чырвоныя фрукты і садавіна. Каб выглядаць маладзей, дастаткова штодня ўжываць палову грэйпфрута і вялікую порцыю салаты з памідораў і папрыкі.

## ДАІ не дрэмле

**Алкаголь і руль — несумяшчальныя. Гэтую ісціну не жадаюць усведамляць некаторыя аўтааматары.**

Як паведаміў начальнік аддзялення ДАІ Мінскага АУС на паветраным транспарце Аляксандр МАЛЫШЭЎСКІ, летась супрацоўнікі толькі гэтага нешматлікага падраздзялення (у ім служаць усяго 5 чалавек) выявілі 23 п'яных вадзіцеляў. Паводле слоў маёра Малышэўскага, некаторыя вадзіцелі памылкова лічаць, што за межамі населеных пунктаў Дзяржаўтаінспекцыя не вельмі пільна сочыць за парадкам на дарогах. Таму падчас выездаў на прыроду такія асобы не прытрымліваюцца «сухога закону», аб чым пазней моцна шкадуюць. Сярод затрыманых аматараў выпіць за рулём пераважалі маладыя жыхары сталіцы. Адметна, што большасць гэтых прыхільнікаў Бахуса не так даўно атрымалі вадзіцельскія пасведчанні, з якімі давялося развітацца на некалькі гадоў ды яшчэ і заплаціць штраф у памеры 20 базавых велічынь.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### Анталогія беларускай песні

## ЗАВУШНІЦЫ

Уладзімір Мулявін ярка выявіўся як спявак і дырыжор, як гітарыст-віртуоз і аранжыроўшчык інструментальных п'ес. Адметнае месца ў яго разнастайнай дзейнасці займае кампазітарская творчасць. Опера-прытча «Песня пра долю» і вакальны цыкл «Я не паэт...» (паводле твораў Янкі Купалы), песенна-інструментальныя кампазіцыі «Праз усю вайну» (на вершы савецкіх паэтаў), «Вянок Багдановічу» (на вершы класіка) і іншыя сталі з'яваю ў культурным жыцці краіны. Песні «Александрына», «Белая Русь», «Слуцкія ткачыхі», «Чырвоная рута» трывала ўвайшлі ў нацыянальную вакальную скарбніцу. Разам з імі — і песня «Завушніцы», напісаная на верш народнага паэта Беларусі Максіма Танка. У ёй па-мулявінску арганічна перададзена багацце адценняў лірычных пачуццяў, услаўлена ўсё пераможнае каханне.

**Міхась ШАВЫРКІН.**




***Верш** Максіма ТАНКА*

***Музыка** Уладзіміра МУЛЯВІНА*

*О, колькі раз прасіў я*
*Назначыць мне спатканне.*
*О, колькі раз хацеў я*
*Прызнацца ёй ў каханні.*
*Ды ўсё перашкаджалі*
*Табе, дзяўчыне, верыць*
*То павадак вясновы,*
*То прымаразак-шэрань.*

*Але і я упарты,*
*І каб свайго дабіцца,*
*Прасіў я шчыра майстра*
*Зрабіць ёй завушніцы.*

*На гэтых завушніцах*
*Я напісаў закляцце.*
*Усё, што не сказаў ёй,*
*А ў чым хацеў прызнацца.*

*Сягоння не ўцячэ ўжо*
*Ад слоў маіх гарачых*
*Ні ў час, калі смяецца,*
*Спявае, альбо плача.*
*Ні ў час, калі прыляжа,*
*Змарыўшыся з вяртання,*
*Звіняць ёй завушніцы*
*Ўсё пра маё каханне.*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЗ РЭЦЭПТА

## Інгалятар заўсёды пад рукой

**Адзін з самых эфектыўных сродкаў супраць вірусных інфекцый і іх ускладненняў — інгаляцыя. Прычым, чым раней пачаць лячэнне, тым лепей. Але што рабіць, калі інгалятара пад рукой няма? Яго могуць замяніць вельмі простыя рэчы, якія знойдуцца ў кожным доме.**



**ЗВЫЧАЙНЫ ТАЗІК**

Калі мы толькі пачынаем захворваць, у нас часцей за ўсё з'яўляецца невялікі насмарк. Значыць, неабходна адразу ж прыняць захады, каб інфекцыя не перайшла ў горла ці бронхі. У хатніх умовах можна зрабіць інгаляцыю ў выглядзе паравой ванны. Для гэтага прыгатуйце лекавы травяны настой.

*Змяшайце ў роўных колькасцях шалфей, кветкі календулы і рамонку. Заліце 0,5 л кіпеню 3 ст. лыжкі травянога збору і настойвайце 5 хвілін, працадзіце.*

Наліце раствор у невялікую міску ці тазік, сядзьце зручна і нахіліце галаву над пасудзінай. На галаву накіньце махровы ручнік і на працягу 10 хвілін удыхайце пару праз нос, а выдых рабіце ротам. Рэкамендуецца рабіць 2—3 такія інгаляцыі на дзень.

**ГУМАВАЯ ГРЭЛКА**

Калі ваша прастуда перайшла ўжо на бронхі, для паравой інгаляцыі вельмі зручна скарыстаць гумавую грэлку. Лекавая пара праз яе шчыліну хутчэй трапляе ў бронхі. У грэлку трэба наліць адвар з траў і абкруціць ручніком.

*Змяшайце пароўну кветкі рамонку, траву святаянніку, ваўчкоў, мацярдушкі. Заліце 0,5 л кіпеню 2 ст. лыжкі збору і трымайце на вадзяной лазні 5 хвілін, затым зніміце з агню і настойвайце пад накрыўкай яшчэ 10 хвілін.*

Гэты збор дапамагае адкашляцца, знімае спазмы і аказвае процізапаленчае дзеянне. Удыхаць пару праз шчыліну грэлкі трэба ротам, а выдых рабіць праз нос.

**ЗАВАРАЧНЫ ЧАЙНІК**

Прастуда, калі яе не лячыць своечасова, можа абярнуцца і пнеўманіяй. У гэтым выпадку рэкамендуецца часночная інгаляцыя. А прыстасаванне для яе правядзення вельмі простае — звычайны фарфоравы заварачны чайнік.

*Прыгатуйце марлю памерам 10х40 см. Натрыце на тарцы некалькі зубкоў часнаку і намажце паверхню марлі часночнай кашкай. Хутка апусціце марлю на дно добра прагрэтага чайніка, наліце ў яго 1/3 шк. кіпеню, накрыйце чайнік накрыўкай і абкруціце ручніком, каб астываў павольней. Вазьміце носік чайніка ў рот, заціснiце ноздры пальцамі і павольна ўдыхайце пару на працягу 8—10 хвілін. Выдыхі рабіце праз нос.*

ЗДАРОЎЕ АД ПРЫРОДЫ

## Эліксір маладосці

Шклянка напою, прыгатаваная з адвару мяты, натуральнага лімоннага соку і лыжкі мёду, падоўжыць не толькі вашу маладосць, але і пазбавіць ад праблем з падстраўнікавай залозай і жоўцевым пузыром, папярэдзіць утварэнне камянёў. Піць такі эліксір трэба штодня зранку.

-2382-

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

## Меню для разумнікаў

**Напэўна, вы чулі, што ёсць прадукты, якія ў лічаныя хвіліны дапамогуць адчуць прыліў сіл або, наадварот, расслабіцца?**

**Калі вы хочаце адчуваць сябе ўпэўнена ў любой сітуацыі і пры гэтым яшчэ і цудоўна выглядаць, звярніце ўвагу на тое, што ляжыць на вашай талерцы.**

**ХУТКАЯ ДАПАМОГА**

Напрыклад, вам неабходна тэрмінова сканцэнтраваць увагу і сабрацца для вырашэння якога-небудзь пытання. Работу нашай нервовай сістэмы выдатна стымулюе **імбір** і **кмен**. Дастаткова з'есці крыху імбіру ці выпіць кменную гарбату, і вы зноў будзеце ў форме. Калі вы стаміліся, а рабочы дзень яшчэ не скончыўся і наперадзе вас чакае важная сустрэча ці сур'ёзная размова з начальствам, успомніце аб **арэхах**. Няхай у вас заўжды ляжыць пакецік арахісу, міндалю ці фісташак. Каму што падабаецца. Яны вернуць вам працаздольнасць. Такім жа дзеяннем валодаюць і **бананы**. У іх шмат сератаніну — гармону задавальнення і тыразіну, які адказвае за канцэнтрацыю ўвагі.

**МЕНШ ТЛУШЧУ!**

Памятайце аб такой важнай дэталі: ежа для розуму і добрага настрою не павінна быць тлустай. Невыпадкова пасля сытнага абеду нас так і цягне задрамаць. Большасць тлушчаў у вашым рацыёне павінна быць з сямейства амега-3. Яны стымулююць работу мозга. Асабліва многа гэтых кіслот у **рыбе**.

**САЛОДКАЕ ЖЫЦЦЁ**

Каб хутчэй «варушыць» мазгамі, нам неабходна салодкае. Гэта значыць глюкоза. Выдатны сродак — невялікі кавалачак **шакаладу** ці некалькі штук **шакаладнага пячэння.** Нават пах шакаладу актывізуе работу мозга. Добра таксама «падсаладзіць» сабе жыццё кавалкам чорнага хлеба, арэхамі і фасоляй. У іх змяшчаецца шмат карысных складаных вугляводаў і поліцукрыдаў, якія павольна расшчапляюцца. Ідэальна, калі вы заўсёды будзеце мець пад рукой **сухафрукты**. У іх шмат вітамінаў і мікраэлементаў, яны задавальняюць патрэбу арганізма ў глюкозе.

**ЗАЎСЁДЫ НА ТАЛЕРЦЫ**

Ешце паболей **ананасаў, лімонаў, яблыкаў**. Яны змяшчаюць шмат вітаміну С, а ён актывізуе работу мозга, і спецыяльныя рэчывы, што паляпшаюць памяць. Не адмаўляйцеся ад **брусельскай капусты** — яна зробіць вас больш уважлівымі. **Морква** ўдзельнічае ў абнаўленні клетак мозга і дорыць вам добрую памяць. **Цыбуля** паляпшае сілкаванне мозга кіслародам, ад чаго думкі «цякуць» хутчэй.

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

## Салата з чарнаслівам



*400 г белакачаннай капусты, 100 г чарнаслíву, 50 г морквы, лімонная кіслата, цукар, кмен на смак.*

Свежую капусту нашаткуйце вострым нажом тонкай саломкай, пасыпце цукрам, перайтрыце рукамі, каб з'явіўся сок. Чарнаслíў заліце кіпенем і дайце пастаяць некалькі гадзін. Выдаліце костачкі і частку парэжце маленькімі кавалачкамі, а некалькі штук адкладзіце для ўпрыгажэння. Моркву натрыце на буйной тарцы. Перакладзіце ўсё ў глыбокую пасудзіну, дадайце прыправы і разведзеную ў невялікай колькасці вады лімонную кіслату. Акуратна перамяшайце. Вылажыце ў салатнік, упрыгожце чарнаслівам і свежым зяленівам.

-2383-

